Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 1 (457) | Панядзелак, 1 студзеня 1940 года | Цана 20 кап.

З НОВЫМ ГОД… ТАВАРЫШ…



Новы шчаслівы год

У промнях нягаснай славы адыходзіць у гісторыю 1939 год, саступаючы дарогу новаму году соцыялістычных перамог — 1940-му. Вялікія гістарычныя справы совецкага народа, даты, якія назаўсёды ўвойдуць у гісторыю чалавецтва, звязаны з 1939 годам.

У гэтым годзе засядаў гістарычны XVIII з'езд вялікай партыі Леніна — Сталіна, які сваімі рашэннямі ўзброіў партыю і ўвесь совецкі народ на барацьбу за тое, каб у бліжэйшы час перагнаць капіталістычныя краіны таксама і ў эканамічных адносінах, ажыццявіць пераход ад соцыялізма к комунізму.

У гэтым годзе совецкі народ, умацоўваючы соцыялістычную дысцыпліну працы, пашыраючы стаханаўскі рух, дасягнуў новых выдатных перамог на фронце індустрыі, павялічыў ўраджайнасць калгасных палёў, узбагаціў культуру сваёй квітнеючай радзімы.

У гэтым годзе нашы пісьменнікі далі чытачу новыя творы прозы, паэзіі, драматургіі, крытыкі, паказалі яркія ўзоры служэння сваёй творчасцю інтарэсам радзімы, справе комунізма. Работнікі мастацтваў нашай рэспублікі натхнёна працавалі па стварэнню першых беларускіх опер, па пастаноўцы новых п'ес беларускіх драматургаў, па стварэнню новых музычных твораў.

У гэтым годзе ажыццявіліся мары нашага народа. Назаўсёды з'еднаўся ў адной дзяржаве пад палымнеючым сонцам Сталінскай Канстытуцыі вялікі беларускі народ.

Слаўны 1939 год завяршыла яскравейшая падзея — бліскучая перамога сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Гэта перамога — велічная дэманстрацыя маральна-палітычнага адзінства совецкага народа, дэманстрацыя совецкага патрыятызма і ўсенароднай любві і адданасці большэвіцкай партыі і таварышу Сталіну, шасцідзесяцігоддзе якога адзначыў у гэтыя … наш народ. З найвялікшым адналуш… працоўныя нашай радзімы галасавалі … ндыдатаў сталінскага блока комун… беспартыйных і паслалі ў мя… …ты дэпутатаў працоўных ад… …ок радзімы.

… пагранічным … ве …фуючага «Сёнова» і … суровы… …сах …ланды, ачышчаемай … белафінскіх банд,—усюды совецкія людзі натхнёна і радасна сустракаюць новы, 1940 год.

З іменем творца нашага шчасця, бацькі і настаўніка народа таварыша Сталіна, горача выказваючы яму ўдзячнасць, любоў і адданасць, уступіў совецкі народ у трэці год трэцяй сталінскай пяцігодкі, які адкрывае новыя грандыёзныя перспектывы працы і творчасці.

Новыя выдатныя справы прадстаіць выканаць у 1940 годзе пісьменнікам, работнікам мастацтваў нашай рэспублікі.

Пісьменнікі будуць натхнёна працаваць над здзейсненнем намечаных шырокіх творчых планаў па адлюстраванню гераічных спраў совецкага народа, росквіту любімай радзімы. Саюз совецкіх пісьменнікаў аб'еднае ў сваіх радах і таленавітых літаратараў вызваленых заходніх абласцей рэспублікі, якія атрымалі шчасце вольна тварыць на карысць свайго народа.

Мастакі БССР закончаць шмат хвалюючых работ і адкрыюць выдатнейшую выстаўку «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Незвычайную радасць прынясе 1940 год усім работнікам мастацтваў Совецкай Беларусі. У Маскве ў пачатку года адбудзецца дэкада беларускага мастацтва. Нашы майстры мастацтваў выступяць з творчым рапартам, з паказам дасягненняў развіцця мастацтва беларускага народа перад вялікім Сталіным, перад кіраўнікамі партыі і ўрада, перад грамадскасцю ўсесаюзнай сталіцы.

І ў 1940 годзе работнікі мастацтваў нашай рэспублікі ўступаюць з усведамленнем грандыёзнасці накрэсленых творчых задач і адказнасці перад народам за выкананне іх.

У цудоўным росквіце сваіх сіл уступае магутная краіна соцыялізма ў 1940 год, які новымі справамі соцыялістычнай працы і натхнёнай творчасці ўславіць і ўмацуе яе. Новыя перамогі соцыялізма запіша гісторыя.

183-мільённы совецкі народ, з'яднаны вакол большэвіцкай партыі, пад кіраўніцтвам любімага правадыра таварыша Сталіна, спакойна і ўпэўнена, цвёрдым постунам ідзе наперад, да сонечных вышынь комунізма.

Наперадзе сонечныя перспектывы новага шчаслівага года, які памножыць нашы радасці.

З вясёлымі песнямі, лікуючы ўступае совецкі народ у новы год працы і перамог.

З новым годам, таварышы!

Вобраз Сталіна ў выяўленчым мастацтве

Чалавек «з галавою вучонага, тварам рабочага, у адзежы простага салдата» (Барбюс), ён — баявы сцяг мільёнаў прыгнечаных, лепшы друг, настаўнік і правадыр працоўнага чалавецтва.

Сталін!

Лепшыя спевакі народа складаюць і співаюць аб ім песні, яго вялікія справы і яго вобраз увасабляюць у натхнёных творах мастакі. Лепшыя дзеячы літаратуры і мастацтва СССР прысвяцілі сваю творчасць ажыццяўленню самай складанай і самай ганаровай задачы — стварэнню мастацкага вобраза вялікага Сталіна, адлюстраванню гераічных спраў совецкага народа, каб сваёй творчасцю натхняць народныя масы на новыя працоўныя і баявыя подвігі, выхоўваючы вялікае пачуццё совецкага патрыятызма — пачуццё любві да сваёй соцыялістычнай радзімы, да вялікай партыі большэвікоў і любімага Сталіна.

Трэба валодаць высокай мастацкай культурай, дасканала валодаць прафесіянальным майстэрствам, трэба звязаць сваё жыццё і творчасць з жыццём і барацьбой народа, узбагаціць сябе марксісцка-ленінскай тэорыяй для таго, каб стварыць яркія і хвалюючыя творы мастацтва аб вялікім Сталіне, яго гераічным жыцці і барацьбе.

Уздым выяўленчага мастацтва БССР, палітычны і творчы рост яго кадраў звязан з работай мастакоў над тэмамі, прысвечанымі Леніну і Сталіну — арганізатарам беларускай дзяржаўнасці. Найбольш значныя творы выяўленчага мастацтва нашай рэспублікі, створаныя за апошнія годы, прысвечаны Сталіну. У зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета БССР знаходзіцца барэльеф Сталіна, зроблены засл. дзеячом мастацтваў БССР А. Бембелем пры ўдзеле скульптараў Рытэра і Ізмайлава. Скульптарамі дадзен велічны і ў той-жа час просты і чалавечны вобраз правадыра. Скампаніраваны ў кругу барэльеф Сталіна абрамлён кампазіцыйна цікавым рэльефам на тэмы героікі соцыялістычнага будаўніцтва і абароны.

Над вобразам таварыша Сталіна шмат працуе засл. дзеяч мастацтваў З. І. Азгур. Да ліку яго найбольш удалых работ у гэтай галіне безумоўна адносіцца эскіз на тэму «Сталін за работай» для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». У гэтай рабоце тав. Азгур змог знайсці смелае і жывапіснае вырашэнне, кампазіцыйна добра і праўдзіва вырашыў ён фігуру правадыра — вялікага мысліцеля. Работу тав. Азгура над тэмамі, прысвечанымі Сталіну, заўсёды вылучае імкненне знайсці глыбокі ідэйны змест вобраза. Аднак, не заўсёды гэта яму ўдаецца. Цікавы замысел, часам, губіцца з-за таго, што скульптар ставіць на першы план форму, вонкавую апрацоўку. Работа тав. Азгура над эскізам «Сталін за работай» сведчыць аб тым, што скульптар шукае і знаходзіць шляхі перамагання гэтага недахопу ў сваёй творчасці.

Скульптар А. М. Бразер працуе над фігурай «Сталін—зодчы соцыялістычнага будаўніцтва». Пастаноўка фігуры, пасадка галавы, палажэнне рук — усё падпарадкавана гэтай цэнтральнай задачы, і трэба сказаць, што тав. Бразеру ў агульным кампазіцыйным замысле фігуры ўдалося знайсці вырашэнне задуманай ім тэмы.

Значную цікавасць прадстаўляе сабою эскіз скульптара Орлова на тэму «Таварышы Сталін і Орджанікідзе ў Рэўваенсовеце Заходняга фронта».

У жывапісу трэба адзначыць партрэт таварыша Сталіна (пастэль) работы засл. дзеяча мастацтваў Я. М. Кругера. Гэта лепшае, што зроблена ім у гэтай галіне. Вопыт мастака, які выдатна валодае тэхнікай пастэлі, сказаўся і ў гэтай рабоце. Мастак надзвычай любоўна аднёсся да сваёй задачы і стварыў праўдзівы вобраз таварыша Сталіна.

Адзін з лепшых мастакоў-жывапісцаў Н. А. Пашкевіч працуе над вялікім палатном, прысвечаным прыёму таварышам Сталіным беларускіх партызанаў у Рэўваенсовеце Заходняга фронта. Эскіз да карціны на гэту тэму выклікаў вялікую дыскусію на творчай канферэнцыі мастакоў БССР у ліпені гэтага года. Адзін гэты факт сведчыць аб значнасці работы мастака Пашкевіча. Калі мастаку ўдасца пазбегнуць некаторай надуманасці ў вырашэнні паасобных фігур (фігура спячага байца і інш.) і зжыць паасобныя петыповыя элементы ў кампазіцыі, пазбегнуць тым самым вонкавага ўражання неарганізаванасці, гэта работа тав. Пашкевіча абяцае быць адной з самых хвалюючых і яркіх работ на выстаўцы.

Безумоўнай творчай удачай з'яўляецца эскіз работы маладога таленавітага жывапісца Е. Красоўскага на тэму «Таварышы Сталін і Орджанікідзе ў Рэўваенсовеце Заходняга фронта». Яснасць і даходчывасць тэмы, удалае жывапіснае вырашэнне — вартасці гэтага эскіза. Трэба толькі пажадаць аўтару больш чоткага і граматнага рысунка, слабасць якога перашкаджае мастаку зрабіць сапраўды поўнацэнную работу.

Нажаль, нельга падрабязна спыніцца на работах (у сілу таго, што яны яшчэ не выстаўляліся) такіх буйных мастакоў, як засл. дзеяч мастацтваў М. А. Керзін і В. В. Волкаў. М. А. Керзін, адзін з лепшых медальераў СССР, працуе над медалю, прысвечанай таварышу Сталіну, а В. В. Волкаў піша эскіз да карціны аб гістарычным пасяджэнні ЦК РСДРП(б) 23 кастрычніка 1917 года, на якім прысутнічалі таварышы Ленін і Сталін.

Калектыў мастакоў нашай рэспублікі папоўніўся значнай групай мастакоў, якія жывуць у заходніх абласцях БССР. Сваю ўдзячнасць партыі большэвікоў, таварышу Сталіну, Чырвонай Арміі — вызваліцельніцы народа яны выражаюць у сваіх работах. Першыя свае работы яны прысвячаюць таварышу Сталіну, яго баявым саратнікам, Чырвонай Арміі. Над гэтымі тэмамі працуюць Н. Рапапорт, Эфроім і Монашэ Зайдэнбойтэль, Ю. Краеўскі (Беласток), І. Файгольд, Н. Гутман (Ліда), Е. Барно (Вілейка) і шмат іншых скульптараў, жывапісцаў і графікаў.

Удасканальваючы сваё майстэрства, авалодваючы марксізмам-ленінізмам і вышынямі мастацкай культуры, натхняемыя пачуццём совецкага патрыятызма, бязмежнай любві да радзімы, большэвіцкай партыі, вялікага Сталіна, — мастакі БССР няспынна творча растуць, узбагачаючы наша выяўленчае мастацтва выдатнымі творамі аб нашай цудоўнай радзіме і вялікім правадыру народаў — таварышу Сталіне.

Д. ГЕНІН.

Сталін у народнай творчасці

Гэта было ў Беластоку. Дзяўчына ішла па вуліцы і голасна спявала песню аб Сталіне. Магчыма, яшчэ задоўга да прыхода Чырвонай Арміі яна ўпотай… …чы гэту песню па радыё, вывучыла яе і, як вялікую тайну, насіла ў сваім сэрцы. Цяпер, калі не стала паноў, песня гэта ллецца ад сэрца, перапоўненага радасцю за свой вызвалены народ. Таму так натхнёна спявае дзяўчына песню аб Сталіне.

Сталін! Усё лепшае, што ёсць у нас — нашы гарады і заводы, калгасны лад, подвігі на Хасане і на палях Заходняй Беларусі, мужнасць седоўцаў, якія завяршаюць свой лёдавы паход, — усё звязана з іменем Сталіна. Совецкі народ любіць Сталіна, таму што ён пасля смерці Леніна, як ніхто іншы, увасобіў у сабе самыя лепшыя і светлыя ідэі працоўнага народа; пасля смерці Леніна ён, як ніхто іншы, мудрым словам і тытанічнай справай сваёй навучыў нас змагацца за вялікую справу Леніна, за шчасце рабочых і сялян.

Совецкі народ славіць свайго правадыра, прысвячае яму лепшыя парывы свайго сэрца. Іменна таму вобраз Сталіна займае цэнтральнае месца і ў мастацкай самадзейнай народнай творчасці. У часы дасуга слуцкія калгасніцы вышываюць яго партрэт, мінскія інкрустатары наносяць на драўляную паверхню рысы яго твару, металісты адкоўваюць з метала барэльефы Сталіна.

У ліку лепшых самадзейных народных мастакоў, якія працуюць над партрэтамі тав. Сталіна, назавём калгасніцу А. Я. Сямашка з Копыльскага раёна. Яна вытка… партрэт, эканомна і выразна перадаў… …камі ткацтва … …правадыра, які даў сялянству калгасны лад, культурнае і заможнае жыццё.

З гэтымі-ж пачуццямі любві і ўдзячнасці да правадыра прысвячае сваю творчасць тав. Сталіну хатняя гаспадыня з Гомеля Н. І. Арбузава. Яна вышыла мастацкі партрэт Іосіфа Вісарыёнавіча. Масцерыца вышыла, як фон партрэта, вышытыя каляровы дыван, што надае ўрачыстасць абстаноўцы. Партрэт зроблен з мастацкім густам, жывапісна. Асабліва каштоўна тое, што гэта жывапіснасць партрэта дасягнута выключна сродкамі вышыўкі, з поўным захаваннем фактуры і спецыфічнага характару яе, як асобага віда мастацкай творчасці.

У творчасці Н. І. Арбузавай гэта не першы партрэт тав. Сталіна. З кампазіцыйных яе работ, прысвечаных тав. Сталіну, адзначым групавы партрэт «Ударніца свеклавічных палёў на прыёме ў таварыша Сталіна».

Над партрэтамі таварыша Сталіна працуюць і мінскія вышывальшчыкі — швейнікі Пукерман і Каган і цесляры-інкрустатары Гебелеў і Шудрык.

Выключна шматвобразна народная творчасць у жывапісу і скульптуры. Адбыўшыяся абласныя выстаўкі паказваюць, што работы мастакоў-самавучак набліжаюцца да ўзроўню работ прафесіянальных мастакоў. Укажам на акварэль мінскага слесара Л. А. Мацука «Ленін і …» … Значную цікавасць уяўляе сабою напісаная маслам карціна былога рабочага віцебскай шчотачнай фабрыкі, пенсіянера Л. Н. Ломінскага — «Сталін пасля ссылкі». З скульптурных работ на апошняй магілёўскай абласной выстаўцы карыстаўся вялікай увагай выкананы ў дрэве рэльеф «Ленін і Сталін». Рэльеф гэты зроблен самавучкай М. І. Гарасуном.

Цяпер фронт народнай творчасці ў нашай рэспубліцы набывае яшчэ большы размах. У Беластоку і Ваўкавыску нам давялося бачыць з якім творчым запалам мясцовыя прафесіянальныя мастакі і мастакі-самавучкі працуюць над новай для іх тэматыкай. Яны пісалі плакаты і партрэты правадыроў для сваіх першых рэвалюцыйных святаў. Мастакі Беластока і іншых гарадоў заходніх абласцей БССР прыступаюць да вялікіх карцін аб Леніне і Сталіне, аб вызваленні Заходняй Беларусі. Мастак Гутман (Ліда) зрабіў меднны барэльеф таварыша Сталіна. Адраджаецца і самадзейная мастацкая творчасць працоўных вызваленага края.

Дзяўчына з Беластока спявае песню аб Сталіне. Слуцкія калгасныя вышывальшчыцы наносяць на палатно рысы любімага твару. Совецкі народ славіць любімага правадыра — вялікага Сталіна.

А. ДАЛІН.

Вынікі выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР

Ад выбарчых камісій па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР атрыманы наступныя даныя аб рэзультатах галасавання:

Па 5-ці абласцях — Віцебскай, Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай і Палескай — у абласныя Советы з 2.908.797 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 2.887.219 чал., што складае 99,26 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Усяго за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала — 2.852.658, што складае 98,8 проц. прымаўшых удзел у галасаванні. Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі згодна артыкула 100 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», аказалася 1.579.

Бюлетэняў, у якіх выкрэслены прозвішчы кандыдатаў — 32 980.

Па ўсіх выбарчых акругах у абласныя Советы выбрана 390 дэпутатаў, з іх: мужчын 271, жанчын — 119; комуністаў — 274, беспартыйных 116.

Па 94 раённых Советах з 2.281.725 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 2.263.368 чал., што складае 99,20 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Усяго за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 2.221.722 чал., што складае 98,16 проц. прымаўшых удзел у галасаванні.

Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі згодна артыкула 100 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», аказалася 1.640.

Бюлетэняў, у якіх выкрэслены прозвішчы кандыдатаў,—38.945.

Па ўсіх выбарчых акругах у раённыя Советы выбрана 4.271 дэпутат, з іх: мужчын—2.852, жанчын—1.419, комуністаў—2.603, беспартыйных—1.668.

Па 35 гарадскіх Советах з 725.279 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 720.315 чал., што складае 99,32 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Усяго за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 707.585 чал., што складае 98,23 проц. прымаўшых удзел у галасаванні.

Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі згодна артыкула 100 «Палажэння аб выбарах у абласныя раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», аказалася 864.

Бюлетэняў у якіх выкрэслены прозвішчы кандыдатаў,—11 303.

Па ўсіх выбарчых акругах у гарадскія Советы выбрана 2.997 дэпутатаў, з іх: мужчын—1 924, жанчын—1.073; комуністаў—1.509, беспартыйных — 1 488.

Па 1.453 сельскіх і пасялковых Советах 2.135.508 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 2.120.496 чал., што складае 99,30 проц. ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Усяго за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 2.054.718 чал., што складае 96,90 проц. прымаўшых удзел у галасаванні.

Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі згодна артыкула 100 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», аказалася 1.736.

Бюлетэняў, у якіх выкрэслены прозвішчы кандыдатаў,—62.775.

Па ўсіх выбарчых акругах у сельскія і пасялковыя Советы выбрана 32.313 дэпутатаў, з іх: мужчын—22.440, жанчын—9.873; комуністаў—5.341, беспартыйных — 26.972.

Па ўсіх акругах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных выбраны кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных.

Па 12-ці выбарчых акругах па выбарах у сельскія Советы балатыраваўшыяся кандыдаты атрымалі менш палавіны ўсіх галасоў, паданых па акрузе, і таму, згодна артыкула 118 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», аказаліся нявыбранымі. У адпаведнасці з артыкулам 118 Палажэння аб выбарах, у гэтых 12 выбарчых акругах назначаюцца новыя выбары.

Змітрок БЯДУЛЯ

З КАЛЕНДАРА 1939

Наш календар — гэта наша штодзённае жыццё, у якім асабістае кожнага совецкага грамадзяніна пераходзіць у агульнае, а агульнае ў асабістае.

Пачнём перагортваць календарныя лісткі.

***

Дэкада беларускай культуры ў Маскве была агульным святам Чырвонай сталіцы. Масквічы сустрэлі беларускіх пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў вельмі горача. Беларускія пісьменнікі выступалі з поспехам у розных клубах па 3—4 разы на дзень. Па вечарах мы бывалі ў тэатрах. Урэзаўся ў памяць Шэкспір на сцэнах маскоўскіх тэатраў. Любоў да Шэкспіра ў нас куды большая, чымся на яго бацькаўшчыне.

***

Мы ў Крэмлі. Пісьменнікам розных нацыянальнасцей уручаюцца ордэны. Мы атрымліваем ордэны разам з героямі возера Хасан, разам з лепшымі стаханаўцамі фабрык і заводаў. У гэтым наша радасць і гордасць. Сівабароды Міхаіл Іванавіч Калінін уласнай рукой раздае кожнаму з нас натхненне і шчасце ў выглядзе ордэнаў.

***

Гістарычны XVIII з'езд ВКП(б).

Беларуская дэлегацыя вітае з'езд. Мы бачым вялікага Сталіна. Гэтыя хвіліны застаюцца ў нас у памяці на ўсё жыццё.

***

Выходзіць з друку раман «Будучыня» нябожчыка Эдуарда Самуйлёнка. Рыхтуецца да пастаноўкі і ставіцца ў тэатры яго п'еса «Пагібель воўка». Наша агульная пісьменніцкая радасць: творы Самуйлёнка — дасканалыя, поўнацэнныя—карыстаюцца ў чытачоў і гледачоў вялікім поспехам. Наш агульны смутак — заўчасная смерць Эдуарда Самуйлёнка.

***

У Доме пісьменніка ў Пухавічах Куляшоў, Броўка, Чорны, Клімковіч, Маўр, Стаховіч, Гурскі, я, Бярозкін, Модаль ды іншыя пішуць новыя творы. Чытаем адзін другому. Прагулкі ў бярозавым парку. Гутаркі аб літаратуры. Кастры. Песні. Сочым у газетах за поспехамі совецкага павільёна на сусветнай выстаўцы ў Нью-Ёрку, за баямі на граніцы ў МНР. Колькі хвалявання і радасці, радасці перамогі. Інакш у нас не бывае і не можа быць.

***

Ферганскі канал — адна з гераічных і паэтычнейшых старонак. За тысячы кілометраў чуў я песні, музыку, бачыў народныя танцы слаўнага узбекскага народа пры натхнёнай рабоце дзесяткаў тысяч людзей. І ўдзень і ўночы кіпела праца. Працавалі старыя і малыя. І тое, што ў буржуазных краінах можа быць зроблена ў працягу некалькіх год, у нас было зроблена за некалькі тыдняў.

Ферганскі канал — тэма для цудоўных эпічных твораў, для песень, для раманаў і п'ес.

***

Юбілеі Шэўчэнка, Шолам-Алэйхема, Салтыкова-Шчэдрына, тысячагадовага эпаса армянскага народа «Давід Сасунскі», юбілей Коста Хетагурава — гэта былі святы ўсіх народаў і ўсіх пісьменнікаў вялікай соцыялістычнай радзімы. Пераклады на беларускую мову твораў юбіляраў, вывучэнне гісторыі кожнага з гэтых народаў, паездкі на ўрачыстыя дні. Такой дружбы народаў, як у нас, не ведае гісторыя чалавецтва. І цікава тое, што даўным даўно, як відаць з твораў юбіляраў і як нам вядома з гісторыі класавага змагання, — працоўныя людзі розных нацый заўсёды жылі між сабою дружна, не гледзячы на перашкоды мракабесаў і капіталістаў розных нацыянальнасцей.

***

Дваццацігадовая мара спраўдзена. Вызвалены народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны з-пад панскага ярма.

Многія з нашых пісьменнікаў апрануліся тады ў чырвонаармейскую вопратк… У рады доблеснай Чырво… шлі Міхась Лынькоў, Кандрат … Стаховіч, Куляшоў, Броўка, Глебка і іншых.

Паездкі пісьменнікаў у вызвален… сустрэчы з роднымі, выступленні, нязведаных радасцей, колькі хвал… Сустрэчы з пісьменнікамі розных … чаных нацый. Сустрэчы з пісь… якія доўгімі гадамі сядзелі ў п… мах. Для пісьменніцкага вока … дні вызвалення зямля ўяўля… лівы кінофільм з жыцця … Разнастайны тыпаж крам… панкоў, ксяндзоў, рабіна… рыкантаў і розных іншых … рабочага класа праходзіў пера… пісьменніка.

Для нашага паслякастрычніцкага п… лення Заходняя Беларусь і Захо… Украіна з'яўлялася жывым дапаможніка… гатовай ілюстрацыяй да вывучэння класа… вага змагання, да «Кароткага … рыі ВКП(б)».

Народнае Сабранне ў Беластоку. Надзвычайная Сесія Вярхоўнага Совета ў Крэмлі. Далучэнне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да вялікай совецкай радзімы.

Падзеі падобны да шчаслівага сну.

Мяне вельмі ўсхвалявала сустрэча ў Мінску двух паэтаў Заходняй Беларусі—Філіпа Пестрака і Максіма Танка. У былой Заходняй Беларусі яны не ведалі адзін другога. Пестрак сядзеў у турме адзінаццаць год, Танк—тры годы.

***

Выбары ў Мінскі горсовет вызначыліся і для беларускіх пісьменнікаў вялікім г… нарам і радасцю—у дэпутаты Мінска… горсовета выбрана пяць пісьменнікаў. … рабоце па выбарах прымалі ўдзел усе н… шы пісьменнікі. У сувязі з гэтым бы… наладжана шмат літаратурных вечароў … розных клубах, таксама адбываліся сустр… чы пісьменнікаў з выбаршчыкамі на кв… тэрах стаханаўцаў мінскіх фабрык і заводаў.

***

Наш дарагі таварыш Кандрат Крапіва, аўтар удалай п'есы «Хто смяецца апошнім», цяпер на фінляндскім фронце. Крапіва там, дзе гераічныя байцы Чырво… Арміі дапамагаюць фінляндскаму пр… наму народу вызваліцца з-поўных … роў манергеймаўскай зграі.

***

Шасцідзесяцігадовы юбілей … Сталіна натхніў і нашых паэтаў і п… нікаў да напісання новых мастацкіх … раў, прысвечаных геніяльнаму любі… юбіляру.

***

Увесь 1939 год мы рыхтуемся … кады беларускага мастацтва ў М…

Год праходзіў з вялікім уздым…

Бывай, слаўны 1939 год! Ты … ціў нашу любімую радзіму вялікі… хамі і перамогамі. Ты ўзбагаціў … думкі і эмоцыі вялікімі гера… яскравымі падзеямі.

Саступаючы месца 1940 году … стаўся юнаком, ты застаўся на… гам, нашым любімцам.

***

Вітаем цябе, 1940 год!

У цёмныя годы народны… га прыгону, у часы панаш… нага свавольля пра цябе м… скі крытык Вісарыён Гры… З начнога змроку стаго… чыў тваё яркае сонца… жыць у нашу эпоху, … ваючай геніяльнай … бе, 1940 год. Гара… цябе. Яго прароцт… спраўджена ў жы…

І творы геніі… вуць — і мы і… на, Гогаля, Лер… слаўных сыно… Пушкіна і … валі буд… цыяліст… тоўвалі …

З. АКСЕЛЬРОД

Да новага года

Так, здаецца, пачынаюць:

Бывай 1939 год! З апошнім бакалам віна, што мы вып'ем да дванаццаці гадзін ночы, развітаемся з табой назаўсёды. Усё кепскае, што было, няхай ідзе з ветрам, а ўсё добрае няхай пяройдзе ў 1940 год.

Пісаць трэба больш і лепш, чым у 1939 годзе. Бачылі мы ў мінулым годзе шмат такога, што павінна быць выказана ў песнях, апавяданнях і п'есах.

Мы бачылі вызваленую Заходнюю Беларусь, радасць, з якой насельніцтва сустракала Чырвоную Армію. Жыхары, якія памятаюць старую рускую армію, не могуць надзівіцца Чырвонай Арміяй, яе гераізмам, тактычнасцю і вытрыманасцю. Яны не разумеюць, што сталася з рускім салдатам. Ялы нейкія цудоўныя людзі, шчырыя людзі, дарагія людзі! Вось аб усім гэтым трэба будзе пісаць у 1940 го...

...ы таксама бачылі тысячы, дзесяткі ... і беспрацоўных, зруйнаваных нямец... ...льскай вайной. Яны пакінулі свае родныя мясціны на тым баку, мн...мія пакінулі ...ават бацькоў, дзяцей,—яны прыйшлі ... яны прыйшлі да нас шукаць новую ...каўшчыну знайсці яе.

...сь усё гэта, што цябе, як паэта, абу... і ўзварушыла, павінна адлюстравац... ... 1940 годзе.

...ы працаваў такжсама і ў мінулым годзе. ...м з тав. Элем Каганам ты напісаў ...у па матывах твораў Мендэле Мойхер Сфорым, якая ў хуткім часе будзе паказана ў тэатры. Ты напісаў рад вершаў, але... твае таварышы больш за цябе зрабілі. І я веру, што ў 1940 годзе я не адстану ад сваіх таварышаў з Масквы, Кіева, Мінска.

У мінулым годзе выйшаў з друку рад твораў малалых яўрэйскіх пісьменнікаў Совецкай Беларусі. З гэтых кніг мне ў першую чаргу хочацца ўспомніць кнігу «Наша зямля» нядаўна памёршага таварыша Моты Дзехцяра. Гэта кніга сапраўднай совецкай прозы, гэта кніга новага пісьменніка, сапраўднага пісьменніка. Колькі цеплыні і замілавання да чалавека, колькі шчырага пачуцця да ўсяго новага, совецкага! Рад добрых вершаў ёсць у зборніках Баўмволь і Целесіна, у кнігах Груб'яна, Рэйзіна і Талалая, якія ў хуткім часе выйдуць з друку.

Свежыя, лірычныя вершы я чытаў у 1939 годзе ў маладых беларускіх паэтаў Куляшова і Панчанкі і ў пачынаючага яўрэйскага паэта Баруховіча. Мне хочацца верыць, што ў 1940 годзе маладыя паэты пакажуць, на што яны здольны, а за нас, іх старэйшых таварышаў, ім таксама не будзе сорамна.

Так мы ўступаем у 1940 год—з імкненнем да працы і з найлепшымі творчымі настроямі. Калі будзе выканана ўсё тое, што мы задумалі, дык і наш доўг перад нашай радзімай будзе аплочан.

А. КУЛЯШОЎ

ТРЫ ВЕРШЫ

РАНАК

Выхаджу я ў разведку —
Рашучы заўтра бой.
Ты, ранак,
Будзь за сведку,
Услед ідзі за мной.
З табой у згодзе поўнай,
Жылі мы з першых дзён.
У барацьбе няроўнай
Я трапіў у палон.
І рукі мне звязалі,
І ў плечы б'е прыклад.
«Вядзі! —
Мне загадалі, —
Паказвай шлях назад...»
Ты, ранак мой вялікі,
У час маіх няўдач
Пад ногі кідай пікі,
Дарогі перайнач.
Дзе рэчку помніў розум,
Там возера кладзі,
Дзе корч,
З карча бярозу
На месцы тым радзі.
Дупло зрабі з засечкі;
Хай птушка ў гэты дзень
Туды свае ячкі
Блакітныя кладзе.
У родную краіну
Дарогі перайнач.
А я? А я загіну.
А ты?
А ты не плач.

ЛЕГЕНДА

З дзяўчынай развітваўся юнак,
Аддаваў яе шляхам, далінам.
— Лепш-бы млынам стаць... —
падумаў так,
І зрабіўся на тым месцы млынам.
Людзі жыта носяць дзень у дзень,
А драўляны млын слухмяна меле.
Замест сэрца — б'юцца жорны ў
целе,
А замест крыві —
Вады струмень...
Кажа нам паданне пра яго,
Што не можа ён з тых чараў выйсці,
Як не перамеле усяго,
Што яму належала калісьці.
Як належала яму не шмат,
Дык спадзе з яго палон драўляны.
Прыдзе зноў ён вольны да дзяўчат,
Ні ў адну яшчэ не закаханы.
А як шмат... але гадаць не след.
Бо адзін ён ведае пра тое,
Што яму належаў цэлы свет,
Як хадзіў з дзяўчынай у жытное.

ШЭРШНІ

Мы хадзілі некалі сюды
Насыпаць у кайстры жалуды.
Потым ты сядзела пад дуплом
Гаспадыняй,
Я — гаспадаром.
Жалудоў дзве кайстры —
Твой пасаг...
Гралі шэршні-майстры
На басах.
Пад равеснікам суровых
Прадкаў
Чай пілі мы з жалудовых
Сподкаў.
А цяпер? Мінае гульняў час.
Сподкі замалыя ўжо для нас.
А дупло для нас занесны дом:
Цёмна ў ім. Не свеціць ён агнём.
Мы з табою хітрымі былі
Раскідалі попел па зямлі,
Пахавалі сподачкі ў траве.
Хто цяпер у доме тым жыве?
Мусіць, шэршні там звілі гняздо
І гудуць, гудуць. Я знаю хто.
То гудзе мой сум. Ён сення злосны,
Ён ляціць.
(Заходзіць сонца ў сосны).
Злосны ён ад нашых стрэч, ад згадак.
Вечарэе. Полем крочыць статак.
Ён ляціць. А па вачах яму
Б'е трава высокая, касая.
Ён бадаецца, карову кусае
Як і мне, і ім маркотна:
—Му...

К. ЧОРНЫ

МАЕ ТВОРЧЫЯ ПЛАНЫ НА 1940 ГОД

У 1939 годзе адбылася ў жыцці беларускага народа вялікая падзея, якая мае непасрэднае дачыненне да нашай літаратуры. Гэта — з'еднанне ўсяго беларускага народа ў адзінай Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы. Мы ўсе марылі аб той часіне, калі на заходняй беларускай тэрыторыі згіне навекі панаванне польскага панства. Але са смуткам думалася: — гэта будзе праз доўгі час, можа, пройдзе многа дзесяткаў год, пакуль гэта здзейсніцца.

У мінулым 1939 годзе я працаваў над раманам аб жыцці двух родных сясцёр. Адна жыла ў Совецкай Беларусі, а другая ў Заходняй Беларусі. Паводле майго задумыслу, кніга павінна была закончыцца тым, што старэйшая сястра з Заходняй Беларусі, пасля гібелі яе сям'і (да гэтай гібелі лагічна і закономерна давёў сям'ю дад польскай панскай дзяржавы), ідзе ў большэвіцкае падполле, дзе ёй, як я думаў, прыдзецца доўгія годы змагацца за вызваленне свайго народа. Гістарычныя падзеі адбыліся хутчэй, чым думалася. І гэта дало новы змест маёй кнізе. Гераіня рамана, заходне-беларуская сястра, становіцца членам Народнага Сабрання, якое ўстанавіла ў Заходняй Беларусі совецкую ўладу.

Над заканчэннем гэтага рамана я буду працаваць у пачатку новага, 1940 года. Пасля гэтага буду працаваць над раманам «Вялікае выгнанне» — аб імперыялістычнай вайне і падрыхтоўцы Кастрычніцкай рэволюцыі. Над раманам гэтым я працаваў ужо ў мінулыя годы. Апроч таго, у планах маёй працы на 1940 год ёсць п'еса на тэму аб вызваленні Заходняй Беларусі з-пад польскага прыгнёту.

Таксама мяркую скончыць у гэтым годзе пачатую яшчэ ў 1938 годзе крытычную працу аб «Новай зямлі» Якуба Коласа — аб гэтым найвыдатнейшым творы нашай літаратуры, які, на маю думку, яшчэ не быў правільна ацэнен.

Г. КАМЯНЕЦКІ

Ростань

Ты ўжо едзеш? Бывай,
Едзеш?—Не забывай
Тых часін, тых мінут,
Як ляжаў я вось тут,
Каля хваль, каля хваль,
І як цэліўся ў даль
У афіцэрскі вагон —
Цягніку наўздагон.
Ты хвілінаю той
Страсянула сваёй залатой галавой.
Абвілася касой
І скрозь ночку пайшла
І адтуль
Праз кусты,
Несла ты
Дынаміт.
Я не цэліўся больш пятніку ў дымны
хвост,
На вадзе
Між ракіт
Распластаўся ўзарваны, разбураны мост.
І пайшлі мы, пайшлі
Па лясной па зямлі
І, скрозь лес ідучы,
Рагаталі ўначы.
А ў той час,
У той час,
Вёрст за дзвесце ад нас,
За тым шляхам глухім,
Пад тым дахам крывым
(Дзе старога мястэчка абрысы вільны)
Твая маці ўсміхалася—бачыла сны.
Быццам едзеш ты, едзеш праз долы,
лясы
І вязе цябе конь выязное красы,
Што ні спіна, ні вось—пырскі сыпле
агнём,
І каляска натружана звонкім дабром,
І сядзішь пад паветкай між скарбаў,
між тых
У ласкавых шаўках твой вясёлы
жаніх;
І табе, і табе ехаць радасна з ім.
Зззяеш быццам лілея ў адзенні сваім.
І скрозь ноч, і скрозь дзень, праз далі-
ны, лясы
Вае да дому вязе конь славутай красы.
У святла паласе
Ноч ляжала ў расе,
Месяц плыў—і, на сінім абрусе святла,
Нам салёдка і хлеб на вячэру была.
Стала весела нам,
Стала лёгка нагам,
Зноў з табой
Мы пайшлі
Па лясной
Па зямлі.
Недзе сыч галасіў у далёкім яры,
Дзве цыгаркі скруцілі мы з горкай
махры.
Ідучы
Паўз карчы,
Рагаталі ўначы.
Едзеш? Зноў я адзін?
Едзеш?—Не забывай
Ні тых дзён, ні часін,
Ні той год, ні той край.

З яўрэйскай мовы пераклаў
А. КУЛЯШОЎ.

Г. БЯРОЗКІН

З ДЗЁННІКА

... ні адзін другі, быў бага... ...нагароджаны совец...

...тым мы пахавалі ... У высокай труне, ...амі, ляжыць Эдуард. ...й праходзяць перад ...я, студэнты, чырвонаармей... ...я вуліца ад Дома пісьменніка да ...ых могілак кімсьці клапатліва пасыпана пяском, каб Эдуарду лягчэй крочыў гэты апошні яго шлях. З непа...мі галавамі мы ідзём за труною. Ці...ае снег... Пройдуць годы, і памяць ...веку, аб мастаку, таварышу Са...у, і гэта мінута развітання, і ...лачучая медзь аркестра не забу... ...згладзіцца ў свядомасці.

**

... Заходнюю Беларусь па да... ...яшчэ свежы сляды нашай ...анныя яўрэйскія мястэчкі ... нас ветліва і цёпла. Масты, ...лакачкі афарбаваны ў «патрыя...ныя» колеры польскага сцяга, каб ...ы не смелі адрывацца ад месца...

Мы начуем ў будынку ваяводства. Ці...шыня. Зусім нядаўна тут, дя ўваходу ў ваяводства, сталі мястэчковыя яўрэі, трымаючы ў руках нясмелыя заявы. Пан ваявода наладжваў балі. Дзе вы зараз, панове? Ад суровага бляску чатырохграннага чырвонаармейскага штыка, як дым, рассеялася ваша былая шляхецкая веліч, растаяў ваш арэол, знікла без славы вусатая, у шпорах, рамантыка... Мы начуем у ваяводстве. Здорава!

**

22 кастрычніка Ваўкавыск выбірае дэлегатаў у Народнае Сабранне.

Усю ноч духавы аркестр пажарнай каманды іграе маршы. З раніцы і да вечара грузавікі возяць па гораду ззяючых ад шчасця дзяцей. Дзеці спяваюць «Кацюшу» і прыносяць шмат прыкрасці пераапранутым і прыціхшым канфедэнтам—агентам дэфензівы. Ашалеўшыя ад злосці і нянавісці, яны вымяшчаюць сваю злосць на яўрэйскім насельніцтве. 21-га, напярэдадні выбараў, азвярэлая банда жорстка расправілася з 13-гадовым яўрэйскім хлапчуком.

Мне давялося бачыць яго пахаванне.

Чатыры рабочых міліцыянеры з чырвонымі павязкамі на рукавах нясуць на моцных плячах забітага хлопчыка. Мужная суровая працэсія!

Я шчаслівы, што мінулы 1939 год даў нашай літаратуры вельмі многа добрых пісьменнікаў. Я рад, што сустрэўся з Максімам Танкам—першакласным паэтам вялікага дыяпазону і вялікай песеннай сілы.

Добрыя вершы ў 1939 годзе напісалі беларускія паэты А. Куляшоў, П. Панчанка, яўрэйскі паэт Г. Шведзік. Па праўдзе трэба сказаць, што ў папярэднім годзе нашы паэты не парадавалі нас вялікімі нечаканасцямі. Трэба меркаваць, што будучы 1940 год у гэтым сэнсе будзе больш удалым і шчаслівым.

**

У 1940 годзе мінае дзесяць год з дня смерці В. Маякоўскага. Гэтай датай у многім вызначыцца характар і змест маёй работы ў наступаючым годзе. З кожным годам усё больш непахісна расце здзіўленне перад вялікай, вясёлай сілай Маякоўскага. Захапляе яго «простая, чалавечая любоў», цалкам аддадзеная будучаму.

Мой 1940 год цалкам звязан з Маякоўскім.

Ц. КРЫСЬКО

СМЕРЦЬ КАМІСАРА

Учора адну папяросу курылі,
Елі ўдваіх з аднаго кацялка,
А сёння вочы яму закрыла
Хцівая, злая рука.
Стаім у глыбокім тужлівым маўчанні
Між сосен суровых у спрадвечным бары.
У гэта апошняе наша расстанне
Помстаю сэрца гарыць.
Сэрца гарыць — і чарсцвее слова,
Стыне ў вачах сляза.
І апускаюцца ніжэй галовы —
Дружа, што сказаць?
На ясны твой вобраз, на голас твой
родны
Без страху ішлі мы ў бой.
Скрозь кулі банд афіцэрскіх, праз Гродна
Ты вывеў нас за сабой.
Уцякаў без аглядкі палкоўнік Дамброўскі,
Забыўшы і гонар, і гнеў
Сам лес аўгусцейшы, сам ...р Аўгустоўскі
Ад сораму пачырванеў.
Ты першым ішоў—і злалзейскаю куляй
Спаткаў цябе цёмны гушчар.
— Наперад! За Сталіна!—зноў мы пачулі,
І спіхнуў наш друг, камісар...
Сэрца гарыць — і чарсцвее слова,
Стыне ў вачах сляза.
У сумнай задуме схіляем галовы —
Што сказаць?
Я зорку знімаю з прабітага шлема,
Свіціцца крывёю яна.
Я сына твайго, піонера, сустрэну
І ціха скажу яму:
— На.
Насі на грудзях, хай не гасне ў сэрцы
Нянавісці нашае жар.
Радасна так за Радзіму памерці,
Як наш баявы камісар.

Лістапад, 1939. гор. Аўгустоў.



Паказам «Рэвізора» Н. В. Гогаля ў Гомелі адкрыўся абласны рускі драматычны тэатр. На здымку: сцэна з V акта камедыі.

Фотахроніка БЕЛТА.

Мікола ЗАСІМ

НОВАГОДНІ ПРЫВЕТ

У гады—вякі, мая краіна,
Ты запвітаеш першы раз
І кат сыноў тваіх, краіна,
Пад навагодні дзікі джаз
Не будзе біць. Паны на мукі
Не аддадуць тваё палі.
У новым годзе твае рукі
Насіць не будуць кайданы.
Не стануць над гарбом народным
Ніколі каты на зямлі...
Я шлю прывет свой навагодні
Магутнай сталінскай сям'і!

Пружаны, 1939.

Літаратурнае жыццё Беластока

У гор. Беластоку згрупіравалася вялікая колькасць пісьменнікаў—беспрацоўных з Варшавы, Лодзі і іншых гарадоў былой панскай Польшчы. Сярод іх ёсць вядомыя яўрэйскія пісьменнікі: паэт Б. Гелер, навеліст Э. Кагаюўскі, Гросман, Рубінштэйн, польская ... пісьменніца Яніна Бранеўская, Сельм, Анзельм і інш. Часовае ўпраўленне горада аддала 2-павярховы будынак для Дома пісьменніка і сродкі для яго рамонту і абсталявання. Больш 50 пісьменнікаў, якія не мелі кватэр, атрымалі кватэры і пакоі. У Доме пісьменніка будзе бібліятэка, творчыя кабінеты, зала для сходаў і вечараў, чытальня, лячэбны кабінет, сталовая і інш.

У снежні адбыўся агульны сход пісьменнікаў горада, на якім было абрана бюро пісьменнікаў. У бюро ўвайшлі т. т. Смоляр, Панчанка, Бранеўская, Блісцінаў, Гелер і Марк.

Бюро пісьменнікаў разгортвае работу. Акрамя пытанняў матэрыяльна-бытавога парадку, бюро пачало работу па вытворчай актывізацыі пісьменнікаў, па марксісцка-ленінскаму выхаванню і інш. Многія пісьменнікі зараз працуюць над новымі творамі, некаторыя апрацоўваюць і заканчваюць пачатыя раней. У бліжэйшы час будуць наладжаны творчыя вечары раду пісьменнікаў: Кагаюўскага, Бранеўскай, Сельм, Міц... будуць прысвечаны ... ...раў гэтых тавар... У ч... канікулаў буд...е пра... ...зен ... ...таратур...ных ранішнікаў. Для гэтай ... створаны дзве брыгады. Мае быць праведзена нарада пачынаючых пісьменнікаў з дакладам аб творчай вучобе.

Пры Доме пісьменніка арганізуюцца гурткі па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», біяграфіі таварыша Сталіна, Сталінскай Канстытуцыі. На працягу бліжэйшых двух месяцаў павінны быць праведзены вечары з дакладамі аб гісторыі беларускай літаратуры (уключаючы сюды і творчасць заходне-беларускіх пісьменнікаў), аб стане сучаснай совецкай літаратуры, аб адносінах да класічнай спадчыны і аб соцыялістычным рэалізме.

Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР павінен наладзіць сталае кіраўніцтва беластокскай групай, штодзённа дапамагаць бюро пісьменнікаў у наладжванні работы, стварэнні лепшых матэрыяльна-бытавых умоў і, галоўнае, дапамагаць творча, даць магчымасць пісьменнікам Беластока рэалізаваць свае лепшыя творы праз выдавецтвы, журналы, газеты.

М. БЛІСЦІНАЎ.

Беласток (наш кар.)

Міхась ЛЫНЬКОЎ

У глухую ноч

(Урывак з апавядання „Ядвісін дуб“)

Так і не давялося ў той год выйсці ...аўцам на панскае поле. Калі паспра... ...ы на другі дзень пайсці туды, ...тусцілі на самай дарозе ўланскія ...ы. Уланы — гэта-ж не свае: з ...варку не пойдзеш, не прагоніш, з ...словам да іх не заступішся. Не ...яшчэ спосабу ў выгадаўцаў, каб сі... ...ю займець над уланамі. А справы... ...ам, разгортваліся і зусім неспа...

...ачы, мо' ад уланскай папяро... з ...кой прычыны, загарэліся ...лі скірты хлеба. Усякім дру... ...гадаўцы кінуліся-б на пажар ...ы тушыць агонь. Такі ўжо... ...ер, каб пажар тушыць гра... ...ёдаўцы, учуўшы цабатны ...ы вялікае зарава над пан... ...ы не крануліся і сядзелі ...хат, ведучы ціхія гу... ...б бязгрыбным лесе, аб... ...ніх. Аб пажары не ... Янусь, углядаю... ...аць палыхаючага ...вяртаючыся, гава...

...х.. Хлеб — гэта ...

...чуце адказвалі ...

...ю-ж само ...вар...

...піку і ўскідваўся снапамі блеклых палявых іскраў на сухадрэвіне хвойны. Сонца тушыла іскравы бляск. Буйны віхор узлятаў вышэй лесу і паволі апускаліся адтуль, кружыліся шэрыя сняжынкі попелу. Там, дзе забіраўся агонь у глыбіню зямлі, у торф, там жаўцелі стромкія бярозкі і затрымцеўшы раптам і страсянуўшы пажоўклай ліствой, глуха падалі на счарнелую, абгарэлую зямлю.

Агонь падбіраўся да графскага бору, да самых Выгодаў. Тады людзі пабралі рыдлёўкі і панурыя, маўклівыя пайшлі бараніцца ад агню, капаць канавы, засыпаць пяском тлеючыя папараці і верасы. Колькі дзён яшчэ прабіваўся агонь, але пайшлі дажджы, абмылі лесавыя выгары і на шэрай абгарэлай зямлі пачалі прабівацца скупою руннню бледныя травы. Толькі на тарфянішчах яшчэ клубіўся дым і доўга стаяў там, аж да самае восені, да спорных восенскіх дажджоў.

Людзі хадзілі, аднак, без працы. Блукалі па лясах — па ягаду, па грыбы, па арэхі. Лясы былі панскія. Злыя былі панскія лесьнікі. Малая была ўдача і на ягаду. Ды невялікі і наедак з той лесавой ягады, калі без хлеба. А на поле, на лесавую работу выгодаўцаў не пускалі.

Была ўжо восень. Першыя замаразкі ўбіралі інеем астуджаную зямлю. У хаце нібы пасвятлела. Бяроза пад акном не засціла неба і скрозь яе вецце назірала Ядвіська, як цягнуць у вырай позніе птушкі. Яна прыслухоўвалася да іх далёкіх галасоў, сачыла за хуткімі хмаркамі... ...ганялі і птушак, хавалі ... праз ... восенскае сонца, узнімалі ...ючы вецер, і ён пырскаўся халодным даждждом, наганяючы цемрадзь у хату.

Надрыўна кашляў тады дзед. Ён мала хадзіў ужо, усё больш адлежваўся на печы і ўсё пытаўся ў Ядвіські, а дзе-ж яе маці.

— Дзе-ж маці? Маці пайшла ў людзі, можа прынясе якой бульбы...

Мутныя вочы былі ў дзеда. Ён нібы ўспамінаў што, нібы нешта хацеў расказаць, але толькі пытаўся зноў:

— Дык пайшла, кажаш?

— Ну, так, пайшла, пайшла... — адказвала нібы са злосцю Ядвіська. Ёй надакучвалі дзедавы пытанні. Дзе маці, дзе маці... Ведае-ж, не маленькі. Ні казак ад яго, нічога, адзін толькі кашаль... Але шкода Ядвісьцы дзеда, дужа-ж ён хворы, пра якія тут казкі пытацца, сама ведае.

— Можа вады падаць, дзеду? — пытаецца ў яго. А той зойдзецца кашлем, нічога не чуе.

Так і не ўчулі аднаго разу за дзедавым кашлем, як моцна загрукаталі дзверы і ў хату ўвайшоў чужы чалавек. Ён не зачыніў дзверы, а брыдка вылаяўшыся, загрымеў на ўсю хату:

— Ці доўга-то я казаць вам буду?

Ядвіська азірнулася, пабялела. Польскі салдат стаяў у хаце і крычаў. Крычаў з усяе сілы. Ён быў нібы напалоханы чым, нібы хацеў перакрычаць свой страх:

— Дык зараз-жа выходзьце з хаты... На вуліцу... Такі загад пана афіцэра... Ды хутчэй... Доўга буду я тут прасіць вашае ласкі...

І ўжо мякчэй:

— То загад пана афіцэра — усім на вуліцу... То пан афіцэр не любіць марудзіць... Прашу вас...

І ў вачах салдата быў страх... А, можа, не страх... Яны ўнікалі глядзець у вочы людзям і палахліва бегалі па закураных сценах, па дзіравай падлозе, на ўбогаму сталу. На ім стаяла пустая міска, тры сухія абгрызаныя лыжкі.

Дзед насілу злез з печы і, схапіўшыся за грудзі, пайшоў на вуліцу, — худы, высокі, босы.

— Ты б хоць лапці, дзеду!

— Не трэба, унучка, нічога не трэба... Відаць, карацелі прыехалі, што-ж мы будзем марудзіць з імі...

Усе выгодаўцы ўжо былі на вуліцы. Тут-жа былі салдаты, некалькі чалавек з паліцыі, нейкія цывільныя людзі ды пан Зыгмунт з панскім сабакам. То быў вялізны, увесь у плямінах, дог. Яго трымаў на ланцугу пан Зыгмунт, які хадзіў, як надзьмуты верабей. Рудыя халяўкі былі ў пылу. Рудым бляскам свяціліся пана Зыгмунта вочы. Трохі п'яны быў пан Зыгмунт і злосны. Але ён маўчаў, толькі думаў: «Праз вас мярзотнікі, непрыемнасці мне. Праз вас мяне лае пан граф... Праз вас, ірады, не бачу я яшчэ свайго ўласнага дома, коней сваіх, сабак... дзе так сваіх...» Падумаў і чыхнуў. — «Даруй мне, пан бог, лішнюю чарку, — з ангельскімі душамі псоў пераблытаў». Чыхнуў і пайшоў па вуліцы ганарысты і злосны. Злосны і труслівы — ні на крок не адпускаў панскага сабаку.

Допыт пачалі адразу.

— Хто паліў? — цікавіліся гэтым.

Дзе-ж тут знойдзеш адказу на такое пытанне. Больш маўчалі ўсе, ці адказвалі скупа:

— Мо' сам бог... мо' паны ўланы... А мы-ж нічога не чулі і нічога не бачылі... Дзе ў нашай цямноце...

Дарэмна дабіваўся начальнік пачуць якое слова ад дзеда Януся. Той маўчаў зусім, сцяўшы зубы, і стаяў з непакрытай галавой, худы, ссутулены. Вузлаватыя пальцы ног мясілі сцюдзёную гразь, зябка дрыжалі дзедавы калены, ды трымцеў на ветры аўсяны колас у жыдкай дзедавай барадзе. І толькі тады, калі падступіўся да яго з кулакамі начальнік, дзед Янусь загаварыў:

— Што вы хочаце ад нас, пан начальнік? Хлеб — вялікі дар божы... Толькі нябесным агнём можна паліць яго... Можа і пакараў госпад бог ... за яго вялікую ... вялівасць...

Аж ускіпе... ...м аж пан Зыгмун... ...раз'юшанага ... аж слінай, давячыся словамі, — быў пан начальнік трохі заікай.

— Я пакажу вам сапраўдную боскую справядлівасць... Я пакажу вам, як бунтаваць у нашай айчыне... Я пакажу вам боскую ласку...

І, звярнуўшыся да салдатаў, грымнуў каманду:

— Уціхамірыць быдла!

Людзі стаялі і нема дзівіліся на цяжкую салдацкую працу. Дзынкалі шыбы ў вокнах, трашчалі выбіваемыя рамы, дзверы. Аж пыл узняўся над усім сялом, калі гэтыя завішныя і ёмкія да працы салдаты пачалі ламаць каміны, бурыць у хатах печы, якія і так ледзь ліпелі. Дзе-ні-дзе высыпалі на вуліцу ў гразь торбы з мукой, выкідвалі на гароды і трушчылі дзежкі, старыя гладышы, драўляныя міскі.

— То папаўся, стары баламут! Будзеш ведаць цяпер панскую ласку, будзеш ведаць, як жыць з людзьмі! — не ўцярпеў пан Зыгмунт, каб не сказаць дзеду, стоячы ля яго хаты. Змаўчаў дзед. І толькі тады, калі працавітыя салдаты пачалі бурыць страху, не сцярпеў дзед, кінуўся да іх, узняўшы ў неба худыя свае кулакі:

— Што вы робіце, дзікія вы людзі!

— Ну, ну! — грозна закрычаў тады надзьмуты пан Зыгмунт і кійком, што быў у руцэ яго, піхнуў дзеда Януся ў грудзі. Той не ўстояў і паваліўся ў сцюдзёную гразь, моцна выцяўшыся аб вугал зруба.

Ядвіся не памятае, як было ўсё гэта. Яна не магла сцярпець знявагі над хворым дзедам. Схапіўшы камень, што ляжаў на двары, яна кінулася на гэтага злоснага пана, які падняў руку на дзеда Януся. Пан Зыгмунт падаўся перапалоханы назад, ён выпусціў ланцужок ад страху. І дзікі, праразлівы дзяўчыны крык паласнуў паветра, сцішыўшы і жаночы енк, і трэск ламаемых стрэх, звон старое, зламанае печы.

Ледзь адцягнулі ад дзяўчыны панскага дога. Пан Зыгмунт, уцягнуўшы галаву ў плечы, бег трушком па гародах. Салдаты кончылі сваю працу, маўкліва выходзілі з вёскі. Яны забралі некалькі чалавек з сабою, каб весці ў горад, у турму.

Над хатамі стаяла ноч, пустая, глухая. Шэрыя, нібы безгалосыя людзі завешвалі старымі дзяругамі чорныя ямíны вакон, дзвярэй, мосціліся начаваць, укладвалі спаць дзяцей.

Некалькі жанчын завіхаліся ў дзедавай хаце. Патрэсквала чадная лучына і ўсё гасла. Раздзьмухвалі вугольле на камянку — ён адзін застаўся ад печы, — зноў палілі лучыну, і ў трапяткім святле завіхаліся ля ... дзе ахінутая ў ...жух ляжала Ядвіська. Абмылі твар ёй, абвязалі чыстай хусцінкай парваную шчаку, падрапанае плячо. І нехта весела сказаў:

— Ну, нічога, будзе жыць! Каб-жа на шчасце!

І пайшлі. Згасла лучына. А дзед сядзеў усё, сядзеў. Сухія камякі падкатвалі к горлу, але вочы былі сухія ў дзеда, дужа скупы быў дзед на слёзы. А яму хацелася заплакаць, хацелася крыкнуць так, каб ад голасу таго загаласілі камні белыя ў лесе, халодныя зоры ў небе. ... не мог дзед заплакаць. Ён сядзеў здрантвелы на лаве, прыслухоўваўся да няроўнага дыхання ўнучкі і адчуваў, нібы і душа дранцвее ў ім, робіцца жорсткай такой, шурпатай. Дужа любіў дзед усё жывое на свеце, шкадаваў ваўчанё забіць, пакуль не абрасце яно злою поўсцю воўчай, не адгадуе зубоў воўчых, няўмольных. А як-жа на чалавека руку падняць?


Доўга абуваўся дзед, не паліўшы лучыны. Надзеў лепшую світку, падперазаўся поясам новым — падарунак унучкі. Намацаў сякеру пад лавай, заткнуў за пояс яе. Пастаяў ля лавы, намацаў унуччын лоб — быў ён потны, гарачы.

— Ну, што-ж, даруй мне, унучка...— прамовіў шэптам і пайшоў з хаты.

Цёмная, глухая восенская ноч стаяла над зямлёй. Вечным гудам сумным поўніўся бор. На мохавых сцежках нячутна хада чалавека.

Та... ...чылі з таго часу дзеда.

С... ...ч



Усеармейская выстаўка мастакоў РСЧА ў Маскве. «Ад'езд таварышаў Сталіна і Дзяржынскага на Пермскі фронт» — карціна чырвонаармейца Бочнева.
Фота-клішэ ТАСС.

1940 ГОД НЯСЕ НОВУЮ РАДАСЦЬ

1939 год прынёс нам — работнікам мастацтваў БССР — шмат радасці і шчасця. У першы дзень 1939 года, калі наша ордэнаносная рэспубліка адзначала сваё дваццацігоддзе, рад вядучых работнікаў мастацтваў быў адзначан і ўзнагароджан урадам ганаровымі званнямі і граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Увесь 1939 год быў годам плённай творчай работы, якая ўзбагаціла наша мастацтва і прынесла вялікае задавальненне нам, работнікам мастацтваў.

Новы, 1940 год нясе новую радасць. Набліжаюцца хвалюючыя дні, калі мы будзем выступаць з творчай справаздачай у Маскве, на дэкадзе беларускага мастацтва, дэманструючы поспехі нашага мастацтва за 20 год.

Няма большай радасці і шчасця, як выступаць перад лепшым другам савецкага мастацтва, перад правадыром народаў — вялікім Сталіным. І гэты гонар мы атрымаем у 1940 годзе. Вось чаму з такім натхненнем мы сустракаем слаўны 1940 год.

У 1940 годзе мне трэба будзе выканаць дзве складаныя і адказныя работы. Гэта — стварэнне вобразаў Вяршыніна ў «Бронепоездзе» Вс. Іванова і гараднічага ў «Рэвізоры» Н. Гогаля — спектаклі, якія рыхтуецца да 20-годдзя Белдзяржзрамтэатра.

Увесь калектыў тэатра з вялікай творчай энергіяй сустракае 1940 год, рыхтуючыся да надыходзячай выдатнай падзеі — дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

В. ВЛАДАМІРСКІ.
Народны артыст БССР.

БУДЗЕМ НАТХНЁНА ПРАЦАВАЦЬ

1939 год быў годам вялікага ўзбагачэння тэатральнага мастацтва нашай ордэнаноснай Савецкай Беларусі. Оперы «Дрыгва» А. Багатырова і «Міхась Падгорны» Е. Цікоцкага, балет «Салавей» М. Крошнера, спектаклі «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы і «Пудоўная дудка» В. Вольскага яскравы прыклад гэтага.

На працягу ўсяго 1939 года тэатры Савецкай Беларусі ўзмоцнена, працавалі па падрыхтоўцы дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, якая адбудзецца ў пачатку 1940 года.

Прайшоўшы год для Белдзяржурамтэатра быў годам няўхільнага творчага росту. Гэтаму росту дапамагла сувязь з брацкім рускім тэатрам, наладжаная праз рэжысёра МХАТ ордэнаносца І. М. Раеўскага, які кансультыраваў спектаклі, прызначаныя для паказу на дэкадзе і паставіў п'есу «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы.

Асабіста для мяне 1939 год быў годам вялікай творчай работы. Мне давялося ажыццявіць пастаноўку п'есы Эд. Самуйлёнка «Пагібель воўка». У якасці рэжысёра і дзякуючы асабістай дружбе з Эдуардам Самуйлёнкам я прымаў удзел і ў стварэнні гэтай п'есы. Цесная сувязь з аўтарам пры яго жыцці дапамагла мне максімальна раскрыць і данесці да гледача вобраз п'есы. Зараз мастаком І. М. Ушаковым зроблена новае афармленне гэтага спектакля, якое больш яскрава раскрывае яго якасці.

Цяпер я працую з заслужаным артыстам Л. Г. Рахленка над пастаноўкай п'есы «Бронепоезд» Вс. Іванова, якая будзе паказана тэатрам у пачатку 1940 года. Нас хвалююць вобразы сібірскіх партызанаў, якія змагаліся ў 1919 годзе за Савецкую ўладу, за наша шчаслівае, свабоднае сённяшняе жыццё. Нам хочацца паказаць гераічную барацьбу народа за сваю новую радзіму.

П'еса «Бронепоезд» мае ў нашым тэатры сваю гісторыю. Першая пастаноўка гэтай п'есы ў 1927 годзе была атакавана ворагамі народа з лагера нацдэмаў, якія намагаліся шляхам гнуснай хлусні зняць гэту пастаноўку з рэпертуара тэатра. Іх стаўка біта. Ніхто не можа парушыць дружбы народаў Савецкага Саюза, і п'еса аб барацьбе братняга народа за ўладу Саветаў будзе войстра хваляваць нашага гледача.

Як актор, я ў мінулым годзе зрабіў дзве новыя ролі: Мірона Бокуця ў п'есе «Пагібель воўка» і прафесара Чарнявуса ў п'есе «Хто смяецца апошнім». Зараз працую над вобразам Вяршыніна ў п'есе «Бронепоезд», які дублірую народнаму артысту В. О. Владамірскаму.

У 1940 год я, як і ўвесь калектыў тэатра, ўступаю з поўным усведамленнем вялікай адказнасці перад нашым народам за дастойную падрыхтоўку паказу беларускага мастацтва на дэкадзе ў Маскве.

К. САННІКАЎ,
Рэжысёр Белдзярждрамтэатра.

АДКАЗНЫ ЭТАП ЖЫЦЦЯ ТЭАТРА

1940 год з'яўляецца вельмі цікавым і адказным этапам у жыцці Тэатра оперы і балета БССР.

У гэтым годзе нам трэба будзе паказаць мастацтва беларускага народа ў Маскве. Нас будуць глядзець лепшыя людзі сталіцы, кіраўнікі партыі і ўрада, нас будзе глядзець Сталін.

Наш тэатр, які з'яўляецца адным з найбольш маладых тэатраў БССР, у гэтым годзе ўпершыню шчыльна ўзяўся за ажыццяўленне першых арыгінальных опер і балета. Шмат цяжкасцей стаяла на гэтым шляху перад аўтарамі, пастаноўшчыкамі і тэатрам. Аднак, тэатр з гонарам выйшаў з гэтых цяжкасцей. Скарыстаўшы вопыт пастаноўкі першай оперы «Міхась Падгорны», тэатр наступныя свае пастаноўкі—«Дрыгва» і «Салавей»—выпусціў на больш высокім ідэйна-мастацкім узроўні. На дэкаду тэатр павязе тры оперы і адзін балет («Міхась Падгорны», «Дрыгва», «Кветка шчасця» і «Салавей»). За тры месяцы, што засталіся на падрыхтоўку да дэкады, тэатр павінен выпусціць «Міхася Падгорнага» у новай рэдакцыі, «Кветку шчасця» і дапрацаваць «Салаўя» і «Дрыгву». У гэтых спектаклях будзе паказана работа беларускага мастака Кроля, прадставіўшага вельмі цікавыя эскізы афармлення оперы «Кветка шчасця». Над пастаноўкай спектакля «Кветка шчасця» апрача асноўнага пастаноўшчыка тав. Шлепянава працуе малады беларускі рэжысёр О. М. Барысевіч.

Значным дасягненнем тэатр лічыць вылучэнне з хора на вядучую партыю Міхася Падгорнага рабочага-беларуса Лазарава, які ў тэатр прышоў нядаўна з транспарту. Лазараў валодае добрымі вакальнымі і сцэнічнымі данымі і, безумоўна, справіцца з гэтай партыяй. Апрача Лазарава тэатр пакажа маладых вакалістаў Шапіхіна і Мільчыну. У гэтым годзе выдатна праявіў сябе ў партыі Сымона малады, таленавіты тэнар Драчын, выхаваны ў тэатры. Адказная партыя Хрысціны ў оперы «Кветка шчасця» даручана таленавітай беларускай артыстцы Пукст. У парадку падрыхтоўкі да агляду тэатральнага маладняка тэатр прадставіў магчымасць маладой салістцы Залівака рыхтаваць ролю Зоські. Клопаты аб далейшым выхаванні і вылучэнні беларускіх творчых кадраў у тэатры з'яўляюцца адной з асноўных задач нашага тэатра на 1940 год.

Тэатр імкнецца да таго, каб замацаваць поспехі, дасягнутыя ў сувязі з дэкадай, а таму ўжо зараз рыхтуецца новы рэпертуар, у першую чаргу беларускі. Услед за дэкаднымі пастаноўкамі тэатр выпусціць чацвертую беларускую оперу —«Кацярыну» кампазітара Шчэглова па лібрэта Клімковіча і другі беларускі балет кампазітара Кабалеўскага аб шчаслівым калгасным жыцці.

У новым годзе, да 100-годдзя з дня нараджэння П. І. Чайкоўскага, тэатр ажыццявіць пастаноўку оперы «Чаравічкі» і балета «Лебядзінае возера».

1940 год павінен з'явіцца годам канчатковага фарміравання творчага аблічча тэатра і стварэння адзінага творчага ансамбля.

Побач з работай над рэпертуарам у тэатры праводзіцца вялікая творчая вучоба. У якасці музычных кансультантаў запрошаны прафесар-ордэнаносец Галаванаў і народная артыстка Саюза ССР ордэнаносец А. В. Нежданава, якія дапамагаюць тэатру ў адшліфоўцы твораў.

Тэатр рыхтуецца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве з вялікім творчым уздымам і энтузіязмам.

О. ГАНТМАН.
Дырэктар Тэатра оперы і балета БССР.

Оперны тэатр рыхтуецца да дэкады

У мінулым, 1939 годзе Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета ажыццявіў пастаноўку першай арыгінальнай беларускай савецкай оперы «Міхась Падгорны» Е. Цікоцкага. Гэта пастаноўка, не гледзячы на рад недахопаў, з'явілася вялікай падзеяй у музычным жыцці БССР.

Наступнай работай тэатра з'явілася пастаноўка оперы «Дрыгва» А. Багатырова, ажыццёўленая засл. арт. РСФСР тав. Шлепянавым, яна сведчыла аб далейшым творчым росце калектыва тэатра.

Вялікай падзеяй для нашага мастацтва з'явілася і стварэнне першага беларускага балета «Салавей» М. Крошнера, пастаўленага засл. арт. РСФСР Ермалаевым і заслужаным балетмайстрам Лапуховым. Гэта пастаноўка сведчыць аб вялікай творчай перамозе кампазітара, пастаноўшчыкаў і калектыва балета.

1940 год з'явіцца знамянальным годам для мастацтва беларускага народа. Увесну гэтага года мы пакажам у Маскве, на дэкадзе беларускага мастацтва, росквіт нашага мастацтва, мы пакажам беларускія оперы «Міхась Падгорны», «Дрыгва», «Кветка шчасця», балет «Салавей».

Зараз наступае самы напружаны этап работы Тэатра оперы і балета. У студзені тэатр пакажа новую рэдакцыю оперы «Міхась Падгорны» ў пастаноўцы рэжысёра Златагорава. Сцэнічныя рэпетыцыі перанесены ўжо на сцэну. У сакавіку гэтага года тэатр пакажа оперу кампазітара А. Туранкова «Кветка шчасця» па лібрэта П. Глебкі і П. Броўкі. Пастаноўшчык спектакля—Шлепянаў. Гэта пастаноўка павінна прадстаўляць вялікую цікавасць, бо музыка оперы пабудавана на матэрыяле беларускіх народных песень і танцаў.

Тэатр замячае паказаць у новым годзе і оперу «Кацярына» кампазітара Н. Шчэглова (па лібрэта М. Клімковіча) і другі беларускі балет кампазітара Кабалеўскага на тэму калгаснага жыцця. Трэба спадзявацца, што пры ўзмоцненай рабоце над беларускімі савецкімі операмі і балетамі Тэатр оперы і балета дастойна пакажа мастацтва беларускага народа на дэкадзе ў Маскве.

А. БАГАТЫРОЎ.



Да 20-годдзя абароны Царыцына. «Выезд таварышаў Сталіна і Варашылава на баявую разведку ў раён ст. Зімоўнікі» — карціна маст. Хвасценка.
Фота-клішэ ТАСС.

ЗА НОВЫЯ ПОСПЕХІ

У падарунак ад партыі і ўрада ў пачатку 1939 года калектыў Белдзяржтэатра оперы і балета атрымаў новы выдатны будынак. Велізарны маштаб сцэны прадстаўляў спачатку цяжкасці ў справе асваення гучання галасоў і сцэнічнай ігры. Усе цэхі запрацавалі па-новаму і з гэтай цяжкасці калектыў выйшаў пераможцам, аб чым красамоўна гавораць шэсць першых спектакляў, выпушчаных за мінулы перыяд.

Упершыню са сцэны прагучалі творы беларускіх кампазітараў. Укамплектаваныя творчыя калектывы і рад вылучаных новых выканаўцаў даюць тэатру поўнае права дэманстрыраваць мастацтва беларускага народа на прадстаячай дэкадзе ў Маскве. Паказ спектакляў на дэкадзе—велізарная і ганаровая задача для маладога савецкага тэатра! Узмоцненая і напружаная работа калектыва і мастацкага кіраўніцтва тэатра безумоўна ўзніме якасць спектакляў.

Грамадскасць і крытыка за апошні час шмат цікавяцца жыццём Тэатра оперы і балета. Справядлівыя заўвагі на рад недахопаў нашых паказаў улічаны і ў бліжэйшы час нашы спектаклі загучаць больш поўнацэнна.

З выкананых мною партый ў мінулым сезоне найбольш цікавай я лічу ролю Саўкі ў оперы «Дрыгва» А. Багатырова. Складаны, шматгранны вобраз і яркая музыкальная канва партыі выклікаюць сімпатыі ў гледача. Саўка арганічны ў спектаклі: усе дзеянні, учынкі яго апраўданы, што ў значнай ступені набліжае яго да закончанага персанажа сярод дзеючых асоб у оперы. Гэту ролю я люблю і выконваю заўсёды з вялікай увагай і жаданнем.

Сезон 1940 года будзе вельмі цікавы для ўсяго тэатра і для мяне ў прыватнасці. У оперы Туранкова «Кветка шчасця» я рыхтую ролю паніча Канрада. Кампазітар змог, апрача добрых хораў, стварыць рад складаных і цікавых вобразаў, над якімі ў сучасны момант працуюць салісты. Канрад у адрозненне ад так званых «блакітных партый», уласцівых амплуа лірычнага тэнара, трактуецца не хадульным прадстаўніком панства, а канкрэтным чалавекам. Крывадушнасць, «пічырасць» манеры, усё, што вызначае характар,—вось крапатлівыя пошукі ў стварэнні вобраза Канрада. Выдатная вакальная партыя і яе гарманічнае акружэнне вельмі ўдобны для голаса.

Спаўняючыйся ў гэтым годзе юбілей вялікага рускага кампазітара Чайкоўскага ў нашым тэатры адзначаецца пастаноўкай оперы «Еўгеній Онегін». Аб ролі Ленскага пісаць цяжка, хачу толькі выказаць надзею і спадзяванне на тое, каб гэта быў пушкінскі вобраз Ленскага, паэтычна выкананы, хвалюючага лірызма і чыстаты.

З пачуццём велізарнай адказнасці рыхтуюцца работнікі мастацтваў БССР да дэкады. Усведамленне гэтай адказнасці натхняе нас. Вялікія перамогі краіны сацыялізма адкрываюць шмат новых цікавейшых творчых шуканняў. Я ўпэўнен, што нашы лібрэтысты і кампазітары створаць новыя поўнацэнныя творы, якія рэальна адлюструюць нашу цудоўную рэчаіснасць. Шматлікая армія спевакоў-артыстаў з вялікай радасцю спявае і будзе спяваць аб гераічных справах шчаслівага народа, які пабеданосна ідзе па шляху к комунізму.

І. БА[illegible]ІН.
Засл. ар[illegible] [illegible]ССР.

УСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ П'ЕСУ

1 студзеня 1940 года пачынаецца ўсесаюзны конкурс на лепшы драматургічны твор. Конкурс абвешчан Камітэтам па справах мастацтваў пры СНК СССР. Мэта конкурса—павышэнне ідэйна-мастацкай якасці савецкай драматургіі і палепшэнне рэпертуару тэатраў, вылучэнне новых таленавітых аўтараў і стварэнне п'ес, адлюстроўваючых барацьбу за пабудову комуністычнага грамадства ў СССР.

Конкурс праводзіцца ў два туры: першы тур арганізуецца па рэспубліках Упраўленнямі па справах мастацтваў пры СНК саюзных рэспублік, другі тур—усесаюзны—праводзіць Камітэт па справах мастацтваў пры СНК СССР. На другі тур прадстаўляюцца п'есы, адабраныя і рэкамендаваныя ў першым туры. Першы тур заканчваецца 1 верасня 1940 года. Вынікі конкурса будуць апублікаваны ў канцы года.

У конкурсе могуць прыняць удзел, побач з пісьменнікамі, усе грамадзяне СССР. На конкурс прымаюцца арыгінальныя драматургічныя творы, напісаныя на любую тэму і ў любым жанры: драма, камедыя, вадэвіль і г. д. на адной з моў народаў СССР.

За лепшыя драматургічныя творы ўстанаўліваецца шэсць прэмій: адна першая прэмія ў 50.000 руб., дзве другіх прэміі па 25.000 руб., тры трэціх прэміі па 15.000 руб.

Аўтарам, творы якіх не будуць прэміраваны, але могуць быць пастаўлены ў тэатрах і выданы, Камітэт па справах мастацтваў пры СНК СССР, на падставе рашэння журы, выдае заахвочваючыя ўзнагароды ў памеры 5.000 руб. Такіх узнагарод будзе пяць.

Аўтары прадстаўляюць на першы тур конкурса рукапіс драматургічнага твора ў адным экземпляры, надрукаваным на машынцы, не пад прозвішчам, а пад дэвізам. Да рукапісу павінен быць далучан пад тым-жа дэвізам запячатаны канверт, у які ўкладваецца лісток з указаннем дэвіза аўтара, яго прозвішча, імя, імя па бацьку і дакладнага адраса.

Творы адрасуюцца адпа[illegible] ленню па справах маст[illegible]



Маскоўскі абласны Тэатр юнага гледача закончыў работу над новай п'есай А. Якаўлева «Піонер Павел Марозаў». **На здымку:** сцэна з IV акта п'есы — «Павел у хаце ў дзеда».
Фота-клішэ ТАСС.

ПЛАДЫ КАМПРАМІСА

„Салавей“ М. Крошнера ў Беларускім Дзяржаўным тэатры оперы і балета

Спектакль «Салавей» М. Крошнера [з']яўляецца сведчаннем творчага росту [бал]етнай трупы Беларускага Дзяржаўнага [тэа]тра оперы і балета. Асноўная заслуга [кал]ектыва заключаецца ў тым, што пас[ля а]сваення класічнай балетнай спадчы[ны] тэатр перайшоў да стварэння нацыя[наль]нага беларускага балета.

[Ал]е, ацэньваючы вынікі работы над [«Сала]ўём», прыходзіцца гаварыць не аб [...] мастацкай з'яве, а ўпаасобку аб [...] існуючых у кантэксце аднаго спек[такля]. «Салавей» — гэта штучнае злу[чэнне] ў адных рамках творча неаб'една[ных ...] жародных цел. Мы гаворым аб [...]ад адным спектаклем двух розных [тв]орчых метадах харэаграфічнай [...] і балетмайстраў А. Н. Ермалаева [і] Лапухова. У выніку гэтага она [...]здарылася тое, што на адным [...] (1 і 4 акты, — балетмайстар [...]) мы можам адзначыць высокай [...]сці дасягненне ўсяго балетнага [...]з мастацтва, з другога-ж (2 і 3 [...] балетмайстар Лапухоў) — бледнасць, [...]невыразнасць.

[...]ім дасягненнем Ермалаева, як [пастано]ўшчыка, з'явілася тое, што ім [...] актыўна ва ўсёй паўнаце выра[...]тымізм светаадчування, мажор[ныя п]ачуццяў беларускага народа, яго [...]я сіла. У нас былі выпадкі, калі [...] механічна спалучаючы асобныя [...] народнай творчасці, лічылі, што [стварае]цца новы народны мастацкі твор і [...]лі гэта сабе ў заслугу. Сумнае заб[лужэ]нне! Цытыраванне народнай творчас[ці с]ама не ёсць стварэнне новага сцэніч[нага] народнага твора. Ермалаеў не пай[шоў па л]іній цытыравання. Яго заслугай [з'яўля]ецца тое, што выцякаючыя з сю[жэтна]й канвы народныя танцы ёсць ко[...]мпазіцыйна і творча мастацкае [...]не. Не адмаўляючы народнай сама[...]ці твор[...], застаючыся па сваёму характару фальклорнымі, гэтыя танцы ёсць з'ява сцэнічнай якасці. Гэта ёсць творчая перапрацоўка фальклору для данясення да гледача высокай ідэі гэтага спектакля — вялікіх пачуццяў, запальваючай весялосці, іскрамётнага смеху, здароўя і радасці. Якойсьці асаблівай вясенняй свежасцю вее ад танцаў 1 і 4 актаў!

Заслугай Ермалаева ў спектаклі з'яўляецца тое, што маса балетнага калектыва зажыла адзіным сцэнічным жыццём, што кожны з удзельнікаў імкнецца да стварэння ідэйна-адзінага мастацкага твора. У гэтым заслуга Ермалаева і як мастацкага кіраўніка калектыва і як выхавацеля.

Але не меншым па сваёй ролі дасягненнем Ермалаева з'яўляецца і стварэнне ім, як балетмайстрам, у спектаклі спецыфічнымі сродкамі харэаграфіі акцёрскага сцэнічнага вобраза. Вобразы Зоські і Сымона — гэта жывыя, блізкія, знаёмыя нам людзі. Глядач верыць іх сапраўднаму жыццю, ён не адчувае звычайнай для балета зашыфраванай умоўнасці. Але гэта даступнасць для гледача, поўнакроўнае жыццё мастацкага вобраза на сцэне дасягаецца не шляхам плоскаснай натуралістычнасці паводзін актора, а ў выніку знойдзеных Ермалаевым уласцівых балету выразіцельных сродкаў раскрыцця вобраза праз танец. Танец у пастаноўцы Ермалаева — гэта не адарваны ад сюжэтнага дзеяння дынамічны кавалак, а адзіна магчымая форма існавання актора ў балеце. Танцавальная спецыфіка ў творчасці Ермалаева гэта не тое, што трэба перамагаць, абходзіць, як скоўваючыя ўзы, а адзіна магчымая мова, якая можа найбольш поўна ва ўмовах балета раскрыць змест.

Спектакль «Салавей» у частках, пастаўленых Ермалаевым, ёсць таксама і рэзультат пленнай сумеснай работы кампазітара і балетмайстра. Дзейснасць, аб'ёмнасць танцавальных музычных кавалкаў, прадпісаныя творчымі заданнямі пастаноўшчыка, з'явіліся той неабходнай глебай, на якой вырасла сцэнічная танцавальная ідэя. Гэта выдатнае сцверджанне таго, што кампазітар балетнага спектакля павінен быць сутварцом балета, як сцэнічнай з'явы, а не адарваным ад гэтай творчай работы. З масавых сцэн, рэжысёрска і кампазіцыйна найбольш выразных, хочацца адзначыць сцэну сутыкнення Сымона з слугамі пана ў першым акце і сцэну паўстання ў апошнім акце.

Першы і чацверты акты «Салаўя» ёсць вялікае дасягненне пастаноўшчыка, значная перамога тэатра ў цэлым.

Іншае прадстаўляюць сабою сцэны другога і трэцяга актаў балета ў пастаноўцы Лапухова. Мы не маглі тут убачыць жывой творчай мыслі. Калі ў творчасці Ермалаева мы бачым асваенне спадчыны, дык у Лапухова — механічнае яе перанясенне. Мы гаворым тут аб класічных балетных рухах. Для Лапухова класічны балет не з'явіўся сродкам, які яму прадстаўляла скарыстаць для стварэння ідэйна новага мастацкага твора. Ён палічыў за лепшае пайсці па лініі найменшага супраціўлення — па лініі некрытычнага пераймання элементаў класічнага танца з старых балетаў. Чым адрозніваюцца класічныя варыяцыі ў «Салаўі» ад варыяцый балетаў тыпу Пеціпа? Наўжо ў Лапухова нехапіла рэжысёрскай фантазіі, каб не пераносіць у беларускі балет мала дасціпныя, надакучыўшыя прыёмы накшталт мнімага адлюстравання актора ў люстры і пляскі пад мелодыю «музычнай скрыні»?

Механічнае перанясенне класічных танцаў у кантэкст сюжэта «Салаўя» не толькі не раскрывае правільна ідэі спектакля, а мажволі губіць заганай.

Балетмайстар павінен быў ведаць, што класічны танец можна ўвесці ў балет такім чынам, што ён будзе несці да гледача патрэбныя мыслі. Класічны танец мае як здаровыя (гераічныя), так і нездаровыя (галантна-жаманныя) элементы ўнутры сябе. Можна было-б даць супрацьстаўленне пяшчотна-утончаных танцаў пануючага класа ў другім акце непасрэдным, аптымістычным танцам першага і чацвертага актаў. Тады было-б зразумела, чаму заганна навучанне сялян танцам у панскім доме.

Не відаць імкнення Лапухова знайсці і арганічную для спектакля ў цэлым харэаграфічную мову. Умоўнасць класічнага танца зусім не вяжацца з шаблонна-натуралістычнымі паводзінамі актора. Незразумелы ўзаемаадносіны асобных сцэнічных персанажаў, лінія якіх праходзіць праз другі і трэці акты. Чым выклікаюцца паводзіны Ванды ў адносінах да Сымона? Гэта простыя здзекі ці капрызы закаханай жанчыны? Трэба прызнацца, што мы да самага канца трэцяй карціны думалі іншае, супрацьлеглае замыслу балетмайстра. Вобраз Ванды наогул ніяк не развіт. Сымон у другім акце—шаблонны тып балетнага прастака, які не ведае, куды сябе падзець. Адзінае яркае месца другога акта—гераічны танец—зусім не выцякае з папярэдняй дзеі і развіцця вобраза ў пачатку акта.

Народная маса ў трэцім акце, дзякуючы логіцы першага акта, дзейнічае непасрэдна, але патрэбнага рытму, патрэбнай унутранай напоўненасці тут не відаць.

Разгледжаная намі частка спектакля сведчыць аб творчай несамастойнасці балетмайстра ў якасці пастаноўшчыка сапраўды народнага спектакля, г. зн. пастаноўшчыка, які асвайвае, а не механічна пераносіць у новы твор старыя танцавальныя формы.

Наяўнасць пры стварэнні мастацкага твора адной аб'ядноўваючай творчай волі з'яўляецца няўхільным законам творчасці. Тут не абавязкова існаванне ў якасці аўтара аднаго чалавека (гісторыя ведае прыклады творчага саюза двух і больш сутварцоў),—гутарка ідзе аб неабходнасці адзінства прынцыпаў у аўтараў, чоткай мэтанакіраванасці для стварэння мастацка-цэласнага твора. Гэтага не было пры пастаноўцы «Салаўя». Законы адзінства мастацкай волі тэатр занядбаў і гэта дало свае рэзультаты.

Акторскія вобразы таксама нясуць на сабе адбітак адзначанай намі супярэчлівасці.

Адным з найбольшых акторскіх дасягненняў спектакля з'яўляецца вобраз Зоські, створаны засл. артысткай БССР А. В. Нікалаевай. Нам ужо прыходзілася адзначаць яркія сцэнічныя даныя артысткі. Велізарнае сцэнічнае абаянне, добры драматычны талент, пластычнасць—не якасці. Артыстка, накіраваная пастаноўшчыкам, стварыла вобраз, які можа быць прызнан адным з найбольш высокіх акторскіх дасягненняў спектакля. Жаночасць, без яе банальнай саладжавасці, непадробленая лірызм, драматычная пататыка, без[...]загнаная тэхніка, [...]ці—рысы яе вобр[аза ...] раза Зоські ў друг[...] рываецца. А наяўнасць [...]тых актах дала-б не толькі [...] вобразу, але і новыя сюжэтныя [...] якія ўзбагацілі-б надзвычай бедны сюж[эт] «Салаўя», садзейнічалі-б больш яркаму раскрыццю спектакля.

Нельга не адзначыць, што засл. арты[...]стка БССР З. А. Васільева, адна з вядучых актрыс балетнай сцэны СССР, так абме[...]жавана і нятворча скарыстоўваецца. Абсалютная нераспрацаванасць вобраза Ванды, адсутнасць асэнсаванай лініі ў ліб[рэ]та балета, ізаліраванасць танцавальных кавалкаў не даюць артыстцы глебы пр[...]мяніць свае выдатныя танц[...] сцэнічныя дасягненні. Якая [...] раскрыцця балета, што Васільева [...] віртуознай сілай выконвае па[...] павальныя нумары? Савецк[...] гэтага ведае яе магчымас[...] стар Лапухоў нічога не [...] каб даць магчымасць Васі[...] сябе ў адпаведнай меры, [...] стаць для актыва спектак[...] ныя гэтай выдатнай арты[...]

Кампрамісныя спалучэн[...] зроблены па лініі лібрэт[...] тэрыял аповесці Бядулі [...] ратурна-значнага тв[...] з'явіўся малавыразна[...] казу яго спецыфічнай [...] вай. Гэта ішоўна стала [...] над лібрэта, што відаць па зменах [...] ці. У выніку агульнага ў балеце [...] цю засталося мала. Але імкненн[...] там ні было захаваць у асно[...] Бядулі павяло да базлі[...] не перарабак, ад якіх тэа[...] спектакля толькі маг[...]

Спектакль «Сала[вей» павінен] быць паказан на [дэкадзе беларускага ма]стацтва ў Маскв[е ...] раваць дасягненні [...] стацтва БССР. А [...] дынальная перарабк[а ...] актаў балетмайстра[м ...] ты адной мастацк[...]

П[...]



Тэатр юнага гледача БССР днямі выпусціў новы спектакль «Снежная каралева» па матывах казак Андэрсена. На здымку: сцэна з спектакля.

Фото С. Гупа.

ДОМ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў БЕЛАСТОКУ

У Беластоку створан абласны Дом народнай творчасці. Дом народнай творчасці пачаў разгортваць работу па арганізацыі гурткоў мастацкай самадзейнасці на прадпрыемствах горада і вобласці, па выяўленню народных талентаў.

У горадзе на сёнешні дзень арганізавана 12 драматычных гурткоў (з іх дзевяць — на фабрыках) і 16 хораў (з іх 13 — на фабрыках і заводах). Усе гурткі забяспечаны кваліфіцыраванымі кіраўнікамі.

Добра пастаўлена работа на фабрыцы «Сокал», актывізіруецца мастацкая самадзейнасць чыгуначнікаў.

Расце цяга да мастацтва сярод разняволеных рабочых і сялян. Новыя кіраўнікі прадпрыемстваў ахвотна ідуць насустрач жаданню мас і дапамагаюць у наладжванні работы, у падборы памяшканняў, у падшуканні сродкаў.

Перад мастацкай самадзейнасцю ў гор. Беластоку шырокія перспектывы. Дом народнай творчасці значна павялічвае сваю рэпертуарную бібліятэку, арганізуе курсы, адкрывае музычныя і мастацкія вучылішчы.

У першым квартале 1940 года будуць арганізаваны $3^1/_2$ месячныя курсы кіраўнікоў драмгурткоў.

М. Б.

Беласток.

КАНЦЭРТ Г. І. ШЭРШЭЎСКАГА

Адбыўшыйся днямі канцэрт маладога піяніста-дацэнта Белдзяржкансерваторыі Г. І. Шэршэўскага заслугоўвае сур'ёзнай увагі.

Выхаванец прафесараў Ленінградскай ордэна Леніна дзяржаўнай кансерваторыі ордэнаносца С. І. Саўшынскага і В. В. Сафраніцкага, ён увабраў у сябе лепшыя традыцыі фартэп'яннай школы першага і асобныя рысы мастацка-выканаўчага аблічча другога.

Выкананне ў Шэршэўскага, перш за ўсё, радуе вялікай прастатой, непасрэднасцю, аддзелкай дэталей, вялікай мяккасцю і абаяльнасцю. Глыбока і ўдумліва прагучалі ў выкананні Шэршэўскага варыяцыі Бетховена. Хвалююча, чулліва, у дымцы ўзвышанага і разам з тым простага рамантызма прагучалі варыяцыі Шуберта-Таўзіга.

З прадстаўленых у канцэрце твораў Ліста больш за ўсё ўдалася Шэршэўскаму «Элегія». Дарэчы твор гэты вельмі рэдка выконваецца на нашых канцэртных эстрадах. У гэтым творы Ліст знайшоў цікавыя гарманічныя звароты, гучанні і інтанацыі.

Другое аддзяленне было прысвечана фартэп'яннай творчасці П. І. Чайкоўскага. Сам па сабе факт паказу фартэп'яннай творчасці Чайкоўскага, які лічыцца па традыцыі кампазітарам сугуба непіяністычным, і ў цэлым аддзяленне— факт значны і паказваючы на сур'ёзныя творчыя задачы, пастаўленыя перад сабою выканаўцам.

Чайкоўскі асабліва ўдаўся піяністу. Выключна абаяльна прагучалі варыяцыі, «Раманс», «Экспромт» і вальс. Шэршэўскаму ўдалося ярка паказаць Чайкоўскага, як фартэп'яннага кампазітара.

Да недахопаў Шэршэўскага, відаць не арганічных, а выпадковых, трэба аднесці нязначнае злоўжыванне п'яно і момантамі зніжанасць волевай актыўнасці, якая сказалася галоўным чынам у выкананні эцюдаў Ліста.

Увогуле канцэрт пакінуў уражанне аб Шэршэўскім, як аб культурным, абаяльным музыканту — мастаку некалькі камернага плана, але з вялікімі творчымі магчымасцямі.

А. ДЭМБО.

Новагоднія шаржы А. Волкава.



Янка Купала.

НАПЯРЭДАДНІ ЎСЕСАЮЗНАГА АГЛЯДУ ДЗІЦЯЧЫХ ТЭАТРАЎ

ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА БССР ім. Н. К. КРУПСКАЙ

Красавік 1931 года... Маленькі пакой дома комсамола перапоўнен моладдзю. Чыгуначнік Мікола Кавязін, цесляр Лёля Капына, вучаніца 8 класа Маруся Заборская і шмат іншых прадстаўнікоў самадзейнасці горада Мінска. Усе яны прышлі на заклік ЦК комсамола—будаваць новы тэатр для дзяцей.

Не без усмешкі ўспамінаюць сёння акторы тэатра свае першыя «гастролі» па Тураўскаму раёну... Транспарт увесь на пасяўной, але абслужыць дзяцей калгаснікаў неабходна. Акторы бралі пад паху свае касцюмы, бутафорыю і з песнямі накіроўваліся ў гастрольнае падарожжа...

З вялікай радасцю сустракалі дзеці прыезд тэатра ў піонерскія лагеры.

Вось што піша выдатніца Мінскай школы Аня Бартаповіч аб выступленні тэатра ў піонерскіх лагерах Гарадзішча:

«Дарагая мамачка! Сёння да нас у госці прыязджалі акторы. Мы глядзелі канцэрт. Было весела-весела. Асабліва мне спадабалася смешная п'еска пра фізкультурнікаў. Адзін піонер зусім падобны на нашага Лёню—за ўсё бярэцца і ні аднэй справы не даводзіць да канца. Пасля канцэрта дзяўчаты пачалі смяяцца над ім,—ён заплакаў. Мы развучылі з акторамі новую песню пра таварыша Варашылава...»

У 1937 годзе тэатр юнага гледача папоўніўся здольнай маладой студыяй, якая паспяхова закончыла свой 4-гадовы курс навучання ў Ленінградскім тэатральным вучылішчы.

Да кіраўніцтва тэатрам прышоў старэйшы майстар беларускай сцэны засл. арт. рэсп. Е. А. Міровіч. З гэтага часу пачынаецца другі перыяд у рабоце тэатра—перыяд творчай прафесіяналізацыі і спеласці.

У вялікіх цяжкасцях нараджалася першая пастаноўка гэтага перыяду—«Як гартавалася сталь», адыграўшая значную ролю ў далейшай рабоце калектыва тэатра.

5 лістапада 1937 года тэатр паказаў прэм'еру інсцэніроўкі твора любімага пісьменніка нашай моладзі Нікалая Остроўскага ў пастаноўцы Е. А. Міровіча. Спектакль атрымаў добрую ацэнку гледача і грамадскасці і ў першы сезон прайшоў 105 разоў.

Наступнай была п'еса «Наша зброя» А. Крона (рэжысёр Ю. Палічынецкі). Гэтым спектаклем тэатр задаволіў жаданні юнага гледача ўбачыць на сцэне нашых герояў—слаўных пагранічнікаў, ахоўваючых ад ворагаў межы Совецкага Саюза.

Пастаноўкай п'есы «Ноч у верасні» І. Чэкіна (рэжысёр Е. А. Міровіч) мы расказалі старэйшым гледачам аб зараджэнні пудоўнага стаханаўскага руху на Данбасе і лепшых людзях соцыялістычнай працы—стаханаўцах.

Жадаючы паказаць герояў любімага дзецьмі рамана Жуль Верна «Таямнічы востраў», тэатр паставіў п'есу па гэтаму твору.

У далейшай рабоце тэатр паказаў нашаму гледачу п'есы аб старой школе «Блакітнае і ружовае» А. Бруштэйн (пастаноўка засл. дзеяча маст. Грузінскай ССР Н. Я. Маршака) і п'есу аб совецкай школе «Брат героя» Льва Касіля.

Маючы ў рэпертуары п'есы совецкіх драматургаў і рускіх класікаў, мы лічылі значным недахопам у сваёй рабоце адсутнасць арыгінальнай беларускай п'есы. У дружнай сумеснай рабоце тэатра з пісьменнікам В. Вольскім, які першым адгукнуўся на заклік тэатра, нарадзілася п'еса-казка «Цудоўная дудка». Творчая работа калектыва з пісьменнікам, які ўпершыню выступіў у нашым тэатры ў ролі драматурга, дала станоўчыя вынікі. Спектакль «Цудоўная дудка» быў цёпла сустрэчан не толькі юнымі гледачамі Совецкай Беларусі, але і насельніцтвам і дзецьмі вызваленай Заходняй Беларусі, дзе мы былі на гастролях у кастрычніку 1939 года.

Апошняй работай тэатра з'явілася пастаноўка п'есы Е. Шварца «Снежная каралева» па матывах андэрсенаўскіх казак (рэжысёр Р. Р. Сусловіч, мастак М. А. Грыгор'еў, кампазітар А. В. Багатыроў). Гэты спектакль паказвае нашаму малодшаму гледачу дружбу юных гарачых сэрцаў, якая перамагае ўсе перашкоды на свайм шляху.

Дзеці цэняць свой тэатр, сваіх актораў. Гэта шчырая любоў нашага гледача ўскладае на нас, работнікаў тэатра, вялікую адказнасць. Мы абавязаны зрабіць яшчэ больш у справе выхавання шчаслівых дзяцей соцыялістычнага грамадства ў духу комунізма.

Рашэнне Усесаюзнага Камітэта аб правядзенні агляду дзіцячых тэатраў СССР яскрава гаворыць аб тых клопатах, аб той увазе, якую аддае наша партыя і ўрад гэтым тэатрам. На вялікі жаль гэту ўвагу не заўсёды адчуваем мы на месцах. Да гэтага часу адзіны ў БССР тэатр юнага гледача вымушан працаваць у непрыстасаваным для дзіцячага тэатра памяшканні.

Мала цікавіцца сваім тэатрам і ЦК комсамола. Мы патрабуем ад нашай крытыкі дапамагаць маладому тэатральнаму калектыву ў творчай рабоце, бо без гэтай дапамогі немагчым правільны далейшы рост тэатра. Мы ўпэўнены, што прагляд творчай работы Тэатра юнага гледача БССР прымусіць Упраўленне па справах мастацтваў, ЦК ЛКСМБ, Наркамасветы, Саюз пісьменнікаў і наш друк штодзённа дапамагаць тэатру.

З 25 па 30 снежня праходзіла творчая справаздача тэатра, прысвечаная Ўсесаюзнаму агляду. У гэтыя дні мы паказалі свае лепшыя пастаноўкі.

Калектыў тэатра гарыць жаданнем быць у Маскве, на Ўсесаюзным аглядзе дзіцячых тэатраў, падзяліцца сваімі дасягненнямі з тэатрамі брацкіх рэспублік, паказаць нашу работу вялікай сталіцы краіны соцыялізма.

В. СТЭЛЬМАХ.

Новагоднія шаржы А. Волкава.



П. Броўка і П. Глебка.



У студыі «Саюздзетфільм» у Маскве заканчваецца пастаноўкай фільм «Мае універсітэты» (трэцяя частка трылогіі аб маладым Горкім). На здымку: кадр з фільма. У ролі Аляксея Пешкова арт. Вальберт, у ролі Машы Дзеранковай арт. Фёдарава.

Фота-кліша ТАСС.

Філіп ПЕСТРАК

КРАІНЕ

Краіна родная! Вітай зару збаўлення,
Бо мы прышлі з астрожных брам,
Скаваных дум прастор і радасць вызвалення
Нясём сваім затужаным братам.
Хай песня зазвініць. Ланцужныя аковы
Насіла ты ў цямрычнай духаце,
Складала ў барацьбе крывавых песень словы
І бунтам сеяла, — штандар твой ліхацеў.
Хай згіне жаль тых вузенькіх палосак
І песня сумная гаруючай жнязі,
Хай згіне крык душы забітых, брудных вёсак
І смерць над панам-катам хай грозна зазвініць!
Рассей, радзімая, па ўсім сваім прасторы
Ўсю моц душы і накіп бойных дум —
Ужо нам не жаліцца аб нашым вечным горы —
Збірайся ў шумную да працы грамаду!
Рубеж крывавы змыт. Дзяржаўны крок грыміць.
Штандарных дзён краса ў праменнях пяцікутных
Да сонца сцеле шлях для паншчыннай зямлі,
Руйнуе ўсе сляды народнае пакуты.
Шукаю цёплых слоў. Я выйшаў з цёмных брам,
І грудзі нашыя пяюць аб гібкай сталі —
Пароль на збор усім вызволеным братам —
На вуснах нашых спеў і родны, мудры Сталін!

Гродна, верасень, 1939.

РУСКІ ДРАМТЭАТР У ГОМЕЛІ

20 снежня ў Гомелі адбылося ўрачыстае адкрыццё Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра, арганізаванага з выпускнікоў акторскага факультэта Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва імені Луначарскага па класу народнага артыста СССР прафесара-ордэнаносца Л. М. Леанідава. У рэпертуары тэатра, які малады калектыў падрыхтаваў у асноўным у інстытуце, класічныя п'есы: «Рэвізор», Гогаля, «Чайка» Чэхава, «Васса Жалезнова» Горкага, а таксама п'есы «Падзь Сярэбраная» Пагодзіна і «Хто смяецца апошнім» Крапівы.

На адкрыцці тэатра прысутнічалі прадстаўнікі партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый, рабочыя прадпрыемстваў, прадстаўнікі навукі, літаратуры і мастацтва. Ад імені Гомельскага абласнога і гарадскога камітэтаў партыі калектыў тэатра вітаў сакратар гаркома КП(б)Б тав. Эльман. З прывітаннямі выступілі пісьменнік Ісбах, артыст МХАТ тав. Бараў, намеснік дырэктара Белдзяржграмтэатра тав. Гайдарын. Былі зачытаны прывітальныя тэлеграмы ад намесніка старшыні СНК СССР тав. Вышынскага, сакратара ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка, старшыні СНК БССР тав. Кісялёва, народных артыстаў СССР таварышаў Леанідава і Качалава і інш.

Пад доўга не змаўкаючыя апладысменты прысутнымі прынят тэкст прывітальнай тэлеграмы правадыру народаў таварышу Сталіну.

Новагоднія шаржы А. Волкава.



Якуб Колас.

КОНКУРС НА ДЗІЦЯЧУЮ П'ЕСУ І ПЕСНЮ ПРАДОЎЖАН

Улічваючы ўзросшыя патрабаванні да стварэння дзіцячай п'есы і песні, пашырэнне тэматыкі ў сувязі з вызваленнем народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі і магчымасці ўдзелу ў конкурсе новых аўтараў, бюро ЦК ЛКСМБ пастанавіла прадоўжыць конкурс на дзіцячую п'есу і песню да 15 красавіка 1940 года.

Тэматыка твораў не абмежавана. Галоўныя з тэм: гераізм і мужнасць Чырвонай Арміі пры вызваленні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, барацьба беларускага народа за сваю свабоду і ўдзел у гэтай барацьбе дзяцей, удзел піонераў у абароне краіны (пагранічныя [illegible]ны, героіка нашых дзён (мары дзяцей [illegible] будучыні, аб рабоце, аб подвігах на [illegible] рысць шчаслівай радзімы), быт совец[illegible] дзяцей (вучоба, канікулы, лагерны ад[illegible] чынак і інш.).

Ад тэкста песні патрабуецца, каб [illegible] быў даходчывым для дзяцей, прос[illegible] ясным, высокамастацкім. Музыка [illegible] павінна быць напеўнай, рытміч[illegible] лёгка засвойваемай, мастацка [illegible] най, разлічанай на выкананне [illegible] лосным альбо двухгалосным [illegible] хорам.

П'еса разлічваецца на выканан[illegible] льнымі драмгурткамі і гурткамі [illegible] моладзі.

Творы на конкурс могуць бы[illegible] стаўлены на рускай, беларуска[illegible] скай і польскай мовах.

За лепшыя п'есы ўстаноўле[illegible] пныя прэміі: адна першая—5.[illegible] лёў, дзве другія па 3.500 руб[illegible] трэція па 2.000 рублёў.

За музыку і тэкст песень п[illegible] ступныя: першая прэмія за ле[illegible] —2.000 рублёў, за лепшую [illegible] 3.000 рублёў; дзве другія па [illegible] лёў за лепшы тэкст, дзве другія [illegible] рублёў за лепшую музыку; тр[illegible] за тэкст—дзве па 750 рублёў [illegible] зыку—дзве па 1.500 рублёў.

Рукапісы падаюцца ў двух [illegible] у адным—твор і дэвіз, у др[illegible] тым-жа дэвізам указваецца імя [illegible] вішча аўтара твора. Творы дасы[illegible] адрасу: Мінск, Комсамольская, 2[illegible] цыі «Піонер Беларусі» з надпі[illegible] конкурс».

Адказны рэдактар І. Д. ГУР[illegible]

Партыйная арганізацыя, [illegible] ленне і групком ССПБ выказ[illegible] глыбокае спачуванне пісьменніку Алесю СТАХОВІЧУ з прычыны [illegible] часнай смерці яго брата ДЗІМ[illegible].

М. КЛІМКОВІЧ

[illegible]УБЛЕНАЕ ЖЫЦЦЁ

[illegible] імя і імёны
[illegible] такіх, якім быў ты,
[illegible] вялікім пачуццём святым
Будуць насіць у сэрцах мільёны.

(Міхась Явар.
Паэма «За сэрцам», 1930).

Прада мною тры сшыткі, вывезеныя з Заходняй Беларусі. Звычайныя вучнёўскія «брульёны» былой Рэчы Паспалітай, спісаныя ўборыстым почаркам маладога беларускага паэта Міхася Явара (Карася). Я не ведаю, дзе ён нарадзіўся, хто былі яго бацькі, чым займаўся ён сам. Я ведаю толькі, што ён быў звычайным вясковым хлопцам у адной з наднёманскіх [illegible] і што, трапіўшы ў лапы дэфензівы, [illegible]шаў адтуль скалечаным душой і [illegible] з апошняй стадыяй туберкулёзу і [illegible] вынесшы бясконцых здзекаў тай[illegible]най паліцыі, ён скончыў жыццё [illegible]ам.

[illegible]ртваю сшыткі, радок за радком [illegible] няспелыя вершы Явара, і пра[illegible]скрываецца ўся жудасная карці[illegible], загубленага польскімі пана[illegible] І аб гэтым жыцці хочацца [illegible]ёй нашай моладзі, якая не ве[illegible]ых умоў капіталістычнага ла[illegible] выкла да любоўнага падтры[illegible]нтаў совецкай уладай і пар[illegible]

[illegible] першы сшытак — паэма «Думы [illegible] адзіноце». Гэта біяграфія паэта. З яе [illegible] даведваемся, што Явар з сям'ёю—бе[illegible]цамі імперыялістычнай вайны—тра[illegible] Расію. Ён быў зусім малым. Ён [illegible] толькі:

[illegible]валюцыя! Пар палянцаў,
[illegible]ругая наспела.
[illegible] імя большавік запеў
[illegible]оным смела!

[illegible]ім'ю пагнула «дамоў», [illegible]ваю вёску. І не лятуцела [illegible]далісь» збыліся. [illegible] першы. Ён дома ізноў—

Попел, вуглі і каменне...

І ўсё далейшае жыццё пайшло па гэтай-жа сцяжынцы: «голад страшэнны», «цяжар падаткаў», «тыфус, нядоля, жабрацтва».

І перад хлопцам паўстала пытанне: дзе-ж выхад? дзе шукаць справядлівасці? Не можа быць, каб законным і справядлівым быў такі лад, калі:

... Мільёны людзей
Днём і ўначы прапавалі.
«Хлеба!» крычалі для сябе, для дзяцей,
І долі ніколі не зналі.
А гультаі часам цэлы свой век
Ніп для сябе не рабілі,
Гора другім пасылалі і здзек...

І хлопец далучыўся да нацыянальна-вызваленчага руху. Афіцыйныя патрабаванні гэтага руху былі параўнаўча памяркоўныя, але ўсе, хто ўдзельнічаў у ім, былі заклеймены як «комуністы», «бандыты», і паліцыя зрабіла ўсё, каб звесці іх са свету. Адно падтрымоўвала хлопца: думка аб тым, што адзіны выхад у змаганні:

— «А ўперадзе што?
Ці і заўсёды так будзе?
Ці так і згінуць, згніюць нізашто
Нашы мужыцкія грудзі?
Ці-ж і да смерці,—ён ціха шаптаў,—
Цяжкая будзе дарога?»
Вецер ў адказ за сцяною пяяў:
«О не! Змагайся! Вас—многа!»

Я пераходжу да другога сшытка — да няскончанай паэмы «Шляхам цярністым». Явар — рыбак па прафесіі. Ён ловіць рыбу на продаж і з гэтага корміцца сям'я. І ў апісанні Нёмана разгортваюцца паэтычныя здольнасці маладога рыбака.

Прамені...

На кропельках рас[illegible] жывой,
У тр[illegible]ве шаўковай, маладой,
На [illegible]авах, красачках, кругом
Яны брыльянтавым агнём
Рознакалёрныя зіхцяць,
Люстраны Нёман залацяць.
А ён, спакойны, ўсё плыве
[illegible] воды [illegible],
І думку тайную сваю
Нясе кудысь у далечыню.
Плыве між родных берагоў
Праз сотні, тысячы гадоў.
Ён сведка прошласці нямой
У краіне роднай, дарагой.
Дзе не адзін мінуўшы век
Рабілі гвалт, чынілі здзек
Літоўскі князь і польскі пан.
А ён — магутны велікан,
Спакойны, вольны, ўсё жыве,
І як калісь — плыве... Плыве
Праз незлічоныя гады,
Стары і вечна малады.

На беразе рэчкі Явара спатыкае яго любая і перадае яму ўсё, што гавораць пра яго ў вёсцы. За рэволюцыйную работу яго недалюбліваюць кулакі і ненавідзяць пан з маёнтку. Явар выпісвае газеты на беларускай мове. «Гэта, моў, большэвіцкія газеты», кажуць класавыя ворагі і распускаюць чуткі, што ён хоча «зрабіць калектывы», начытаўшыся гэтых газет. Яго дыскрэдытыруюць, як толькі мага. Сам бацька непрыхільна глядзіць на ўпартасць сына. Але сын ідзе сваёй дарогай і...

Пяройдзем да трэцяй паэмы «За сэрпам». Той самы Нёман, тая самая вёска, тыя-ж:

Старыя, стройныя таполі,
Што там за вёскаю стаяць,
Не гнуцца ні праз кім ніколі.

І тая-ж дзяўчына Ніна, якая цёплым вечарам выходзіць на бераг Нёмана, дзе яна сустракалася калісь са сваім мілым, які зараз «даўно за кратамі стальнымі пакутуе і дзень і ноч»:

«О, паны! — ціха прашапталі
Вусны дзявочыя, — за што,
За што скавалі і схавалі
Майго саколіка, за што?
Няўжо ён вінен ёсць за тое,
Што ў маладых грудзях сваіх
Ён мае сэрца маладое,
Шмат лепшае, чым у другіх?
— А ён далёка! Там ў турме,
Што ноччу й днём глядзіць панура,
Ён там, дзе «лад», «парадак», дзе
«Цвіце заходняя культура».

[illegible] у гэтых радкі [illegible] сам беларускіх нацыянал-дэмакратаў, глашатаў «заходняй арыентацыі» беларускай літаратуры. У панскі засценак, на дыбу польскай дэфензівы вялі яны літаратурную моладзь, а не на «ўзвышшы», якія «ўбачаць вякі і народы!»

Далей ідзе ў паэме ноч у турме, цяжкія думы аб лёсе народа, упэўненасць у перамозе народа і поўнае апраўданне свайго шляху.

Рассцілаючы лён на беразе Нёмана, Ніна пачула ад сяброўкі, што гэтым восенскім днём паны выпусцілі з турмы яе Валодзю. Як лёгкакрылая птушка, кінулася яна на спатканне. Але:

О, божа! што з яго зрабілі?
Які ён бледны і худы.
А моцна-ж як перамянілі
Яго астрожныя гады.

Адно гора змяняецца другім. Уладзімір, які любіў яе да турмы, пяшчотна, але ціха адхіляе яе ад сябе:

Я ў сухотах... Я не твой,
Я ўжо нічый. З турмы дадому
Мяне пусцілі тыраны,
Бо ўжо пазналі і яны,
Што тут, на свеце, анікому
Не ўтрымаць мяне, о не!
І ні на волі, ні ў турме!

Далей раздзел паэмы прысвечан прадсмяротным размовам Уладзіміра з сваім старым бацькам і маткаю, — размовам, поўным веры ў тое, што:

З зямлі, вякамі што ў няволі
Стагнала пад чужой пятой,
З зямлі, палітае крывёю
Узрасце святая кветка волі.
Воля! Яна, як чырвань сонца,
Засвеціць хутка над зямлёй
Усім абяздоленым ў аконца,
Яна пашле праменьчык свой.
О ты, жаданая часіна,
Ідзі, ідзі, пара твая,
Хоць паміраю, веру я,
Ты ўскрэснеш, бедная краіна!
Твае мільённыя сыны
На новы лад жыццё збудуюць,
Між вольных вольныя, яны
Сабою самі пакіруюць.

Не гледзячы на просьбы маці, Уладзімір [illegible]:

Таго, х[illegible] ходзіць у чорным вечна,
З такой-жа чорнаю душой,
Пад маскай дабраты бязгрэшнай.

Уладзімір памёр, як баец, на пасту, аддаўшы ўсё жыццё да кацлі той справе, якая павінна была ратаваць народ. Гэткім бачыў, відаць, паэт і свой канец. Паэма заканчваецца малюнкам на могілках.

Там і яго ў пяску сырым
Навекі ціха пахавалі.
І гэтак сама, як і ўсім,
«Вечную памяць» прапялі.
Паміж ажынавых кустоў
Ужо крыж над ім ўкапаны
Стаіць, на ім Хрыстос бляшаны...
Так загінуў чалавек толькі за тое:
Што ў гэты... о, ў дваццаты век!
Пасмеў сказаць у вочы смела,
Што ён таксама чалавек.
Спі, мучанік, бо твае грудзі
Ужо знайшлі спакой сабе.
Спі! хай-жа лёгкім пухам будзе
Зямелька родная табе,
Якую шчыра ты любіў,
Дзе шмат страдаў і мала жыў.

На могілкі прышла Ніна, каб ускласці кветкі на свежую магілу і сказаць, што:

Словы калішнія твае...
Яны дарэмна не прапалі
І ў душу мне навек запалі...
І я, як ты калісьці, смела
Іду, хоць мо' й не надта ўмела,
Іду па сцежачцы тваёй.

Усе гэтыя паэмы не пазбаўлены сантыментальнасці, напісаны яшчэ няроўнай мовай, але яны ярка рысуюць жыццё беларускага селяніна-юнака, які пасмеў падняць голас пратэсту супроць абураючага бесчалавечага ўціску панскай Польшчы на Заходняй Беларусі. Мімаволі набягае параўнанне з Бахрымам — паэтам, прыгонным селянінам, які прапаў «з панскае ласкі», у Крошыне. Колькі Бахрымаў задушыла чорнай памяці белая Польшча за гэтыя дваццаць год!

Як вянок на магілу аднаго з іх, ускладаю к абнародванне лепшых радкоў з яго твораў, выконваючы яго жаданне, каб яны дайшлі да народа.

[illegible]рна «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Б—1863.